Новы Час 27 лістапада 2020 | № 45 (704) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №11

Літаратурная Беларусь

Выпуск №11 (171)
(лістапад)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Насця

Кастусь РАМАНКЕВІЧ

***

З выццём сірэн, пад выстралы і крыкі
які табе прысніцца сёння сон?
На сценах смерць малююць страху блікі,
і над сівой Нямігай — болю стогн.

Заснеш, і ў садзе бронзавы Міцкевіч,
як сведка крыўдаў, сораму, пакут,
ля сцен старых турмы баіцца верыць,
што боль яго вярнуўся ў родны кут.

У хама — тыя ж хамскія замашкі,
закон яго — калгаснае ярмо.
З дзяцінства верыць мы прывыклі ў казкі,
ды ў школьскіх казках не жыве дабро.

З выццём сірэн, пад выстралы і крыкі
заснеш, а свет — у новай барацьбе.
У Бога ён — як ты — роўнавялікі.
І я зайздрошчу лёсу і табе.

Тралейбуса доўга не было. Назапашаная ўнутры трывога станавілася невыноснай, нібы пякотка. Адпіўшы пару глыткоў з пластыкавай бутэлькі, дзяўчына пачала выкрочваць толькі па ёй вядомым маршруце вакол празрыстага навеса прыпынка.

«Галоўнае — не спазніцца, галоўнае — не спазніцца, — заглушаючы трывогу, застукала ў скронях. — ...не спазніцца».

Вось ён, чортаў рагаты, і, што дзіўна, амаль пусты. Насця ўвайшла ў заднія дзверцы няспешна, прапусціўшы тоўстага дзядзьку з вялікай клецістай сумкай.

«Мама з такімі ў Вільню ездзіла, калі чаўночнічала. Дурніца, — пранеслася ў галаве, — пры чым тут сумка? Сумка пры чым?»

Тралейбус крануўся. У яе вучнёўскі. Сядаць не хацелася; учапілася ў адпаліраваную трубу, прыціснулася ілбом да вялікага задняга шкла; хваляванне неяк сунялося. Вочы самі па сабе заплюшчыліся. Тое, што з ёй адбылося, здавалася чужым, нея выпадкова заляцелым у яе жыццё, усё было не з ёй, побач, не яе...

З Косцікам яны сустракацца пачалі, можа, дзесьці больш за год таму. Увесну прынялі сумеснае рашэнне, што ў іх каханне, — і першы раз пацалаваліся. Ад тых пацалованак больш было смеху і стуку зубоў. Косця ганарыўся паступленнем у БНТУ на бюджэт, а ёй заставаўся яшчэ цэлы год сумнай і тупой школы. Не, Насця вучылася не дрэнна, за медалём не гналася, але з першага класа трымалася моцнай выдатніцай. На рэпетытараў грошай у сям'і асабліва не было, дапамагалі мамчыны сяброўкі цёткі Вера і Адэля. Адна з фізікай і матэматыкай, другая з англійскай і рускай. За мамай была хімія; у школе ж настаўнікі па гэтых прадметах мяняліся ледзь ці не кожнае паўгоддзе, а замежную замянялі грамадазнаўства і фізра.

Косцікава паступленне адзначалі з танцамі і кактэйлем. Цалавацца яны да таго часу ўжо навучыліся. Сэрца даходзіла да ліхаманкавага трапятання, кроў гула па ўсім целе, салодкі туман засціў мазгі. Павольна і ўладна вялікая таямніца жыцця клікала іх усё далей, усё бліжэй прыціскаючы целы адзін да аднаго. Неяк за пацалункамі іх застукаў ля пад'езда яе бацька. Скандалу не было, але дачку пагнаў дадому, а працягнутую для знаёмства руку маладога чалавека пакінуў без увагі. Яе дома абазваў нядобрымі словамі і забараніў сустракацца «з усялякімі казламі»; са словамі «За казла адкажаш!» дачка абвясціла бацьку поўны байкот.

Вечар дзявятага жніўня быў ціхім нядзельным вечарам і нічога асаблівага не прадвесціў. На выбары, праз сваё непаўнагоддзе, яны не хадзілі, гулялі са знаёмымі па цэнтры і, вядома ж, рыхтаваліся пасля дзесяці паўдзельнічаць у пратэсце, калі такі ўтворыцца. Ім, як і ўсім, у каго яшчэ не паспелі закіснуць мазгі, хацелася перамен. Можа, ад таго, што ў апошні час у кавярнях і на адкрытых верандах часта круціці песню Цоя, а можа, наадварот, гэта ім самім хацелася, каб усё адбылося, як спявалася ў песні. Навошта і якіх канкрэтна хацелася пераменаў, яны толкам і не задумваліся. Пераменаў — і ўсё!

Насценька, да закаханасці, наогул у нейкую крамолу, як лічыў яе бацька, маёр АМАПа, старалася не ўлазіць, дарэчы, і за ўладу яна асабліва не прыла. Яна была салідарная з мамай: жанчына — найперш гаспадыня, клапатлівая маці, любячая жонка. Праўда, з любоўю ў Алены Пятроўны ў сям'і былі нелады. Бацька яе пару разоў, яшчэ на старой кватэры, адлупцаваў, так, абы за што, «для прафілактыкі», як ён крычаў. Насця моцна спалохалася, нават пэўны час заікалася, і яны з'ехалі з мамай да бабулі ў Баранавічы. Амаль паўтара гады там пражылі. Бацька прыязджаў з тартамі і кляўся, што больш такога не паўторыцца, што ўсяму віной праклятая служба. Маці паверыла, хоць ранейшых адносінаў у сям'і ўжо не было.

Косцік жа, наадварот, быў ідэйным, бацькі актыўнічалі ў БНФ у Горадні, прабабулю расстралялі ў трыццаць сёмым у Курапатах — як нацдэмаўку. Яе значок у выглядзе бел-чырвона-белага сцяжка заўсёды быў з ім ці на лацкане пінжака, ці на яго адвароце, ці ўнутры скуранога кашалька, – нібы значок камісара паліцыі ў Італіі. У спрэчках і доўгіх дыскусіях па пытанні, за што ён збіраецца змагацца, Костусь нязменна адказваў: «Супраць усеагульнага калгаса ў нашых мазгах і адзінага, нязменнага пастуха». Дарэчы, ён быў упэўнены, што Канстанцінам яго назвалі ў гонар Каліноўскага.

Ці была яна згодная ва ўсім са сваім каханым? Раней яна б не змагла адказаць адназначна, а вось цяпер з ім — абедзвюма рукамі.

«Наступная — "Бальніца хуткай дапамогі"», — прашапацела ў дынаміках.

Корпус знайшла хутка, але наведванне дазволена толькі з шаснаццаці трыццаці. Яшчэ амаль сорак хвілінаў.



Фота www.tut.by

Насця абышла корпус, убачыла вольную лаўку і прысела. Мулкія жоўтыя дошкі здаліся зручнай канапай. Напружанае цела абмякла, выштурхваючы вонкі ватнюю слабасць. «Не заснуць бы толькі, — праплыла з асцярогай думка. — Жах, я ж не спала амаль чацвёра сутак, здаецца, столькі ж толкам і не ела. Мама вар'яцела, а я тупа набірала Косцеў нумар ці нумары агульных знаёмых». Але ўсё без толку: слухаўка заходзілася захлынальным брэхам гудкоў, як вясковы сабака ўначы.

...Усёй кампаніяй выпаўзлі на вуліцу з Косцікавай двухпакаёўкі, якая дасталася яму ад дзеда, і падаліся на Машэрава, балазе тут побач. Ужо было цёмна, вакол досыць людзей і мянтоў. Моладзь, можа, і нападпітку, часам нарываецца на скандал. Народ гучна скандаваў «Сыходзь!», «Верым, можам, пераможам!», «Жыве Беларусь!». Спачатку было прыкольна. Потым прыехалі амапаўскія бусікі і аўтазакі, нейкія машыны, падобныя да снегаўборачных, а потым яшчэ і яшчэ. Страшных чорных людзей, закутых у чорныя латы, станавілася ўсё больш і больш. Шчыты злавесна паблісквалі і здаваліся жывымі.

— Косцік, давай пойдзем адсюль, мне страшна.

— Я побач, усё будзе нармальна, ты бачыш, колькі нас, яны пабаяцца. — Хлопец ускінуў уперад правую руку са сціснутым кулаком. «Жыве Беларусь!» І тысячагалосая людская маса ў адзіным парыве выдыхнула «Жыве!!!».

Ад гэтага Настулі стала яшчэ страшней: яна ведала, што з таго боку стаяць злыя, моцныя людзі, у якіх ёсць загад, і яны яго выканаюць, за гэта ім плацяць грошы і даюць кватэры.

— Міленькі, родненькі, пойдзем, пойдзем, яны цяпер на нас кіну...

Дагаварыць ёй не далі выбух і асляпляльная ўспышка справа ад іх. Закрычаў і, махаючы рукамі, упаў доўгі хлопец зусім побач з імі. Амапаўцы загрымелі аб свае шчыты і павольна рушылі на іх. Гранаты рваліся ўжо ўсюды, над галавой брыдка вішчалі пластыкавыя кулі. Людзі крычалі ад болю, спрабавалі павярнуць назад, але задняя націскалі, ім хацелася паглядзець, што там наперадзе, ім хацелася дзеяннаў. А раптам усё скончыцца без іхняга ўдзелу і яны не стануць сведкамі перамогі. І ніхто тады не ведаў, што пярэднія фактычна сталі жывой бранёй, якая выратавала іх ад калецтваў, а можа — і смерці.

Канстанцін, закрыўшы яе сабой, пабег скрозь некіравальны натоўп улева да Свіслачы. Яна чула, як двойчы гучна ўскрыкнуў, — але працягваў яе цягнуць наперад да моста, які яшчэ не паспелі перакрыць; з боку гасцініцы хлынула вялікая людская хваля, ёй у спіну таксама стралялі. Прыкры рыжы дым драпежна клубіўся над галовамі і хваламі поўз да пасольскага гарадка. Дзяўчыну нехта моцна штурхнуў у спіну, яна ўпала наперад, балюча разбіла калені і рукі.

— Косцік, Косцік, — як ёй здалося, гучна паклікала яна. Ніхто не адказаў. Праз яе пераскоквалі ўцекачы, нехта балюча наступіў на руку. Сабраўшы ўсе сілы, Насця паспрабавала сесці. Яе яшчэ раз штурхнулі.

— Цішэй, не пры́це, тут нейкая дзеўка ляжыць! — закрычаў нехта над ёй.

— Жывая?

Нечая рука пацягнула яе ўверх да выратавання.

— Збярыся, дзяваха, уставай — і бягом са мной, — уладна вымавіла жанчына, цягнучы яе за сабой.

Усё вакол бегла, цяжка дыхала, раўло, мацюкалася, штурхалася і зноў бегла. Рука незнаёмкі, як ціскі, схапіўшы яе запясце, цягнула наперад. Яна не азіралася, але ведала, што чорныя людзі, — хваля за хваляй, бразгаючы палкамі аб шчыты, — ідуць за імі; ёй чамусьці — ні да сяла, ні да горада — успомніўся дапатопны фільм пра Аляксандра Неўскага, дзе вось так, тупа бразгаючы жалезам, наперад ішлі сабакі-рыцары. Ад бегу ў горле стаяў прыкры камяк з металічным прысмакам. Лёгкія ўжо не слухаліся і гатовыя былі лопнуць, а яны ўсё беглі і беглі. Толькі на другім баку праспекта, заскочыўшы ў калодзеж нейкага двара, яны спыніліся.

— Не садзіся, не садзіся, — адпускаючы руку, сказала жанчына. — Павольна хадзі і махай рукамі, дапамагаючы лёгкім і выроўніваючы дыхалку. — Яна паказала, як гэта трэба рабіць.

Дыхаць стала лягчэй. У галаве білася толькі адна думка: дзе Косцік?

Працяг на стар. 8 (2) »

Насця

« Заканчэнне.
Пачатак на стар. 1 (7)

— Ты далёка жывеш?

— У раёне Казлова, на таксі хутка.

— Ох, дзеўка, гора мне з табой! Якое таксі? Зараз самае хуткае таксі — аўтазак. Чаго ў самую кашу паперлася?

— Так, з хлопцам і кампаніяй за справядлівасць прыйшлі пабузіць.

— Маці вашу… бузацёры! Вось і мае туды ж пасунуліся. Старэйшая дачка нейкімі партызанскімі сцежкамі аж з Масквы прыперлася. За каго хоць галасавалі?

— Дык мы яшчэ малагодкі…

— Мата не хапае! Я тут непадалёк жыву, да раніцы схаваемся. А заўтра пойдзем па турмах шукаць сваіх.

— Але ж Косцік…

У двор убеглі два хлопцы і дзяўчына.

— Гэй! — з балкона другога паверха пазваў іх хрыплы жаночы голас. — Цісніце на дамафон 12-14 — і да мяне мухай.

Паўтарацць запрашэнне не давялося. Жалезныя ўваходныя дзверы па-здрадніцку павольна зачыняліся. Пстрыкнуў замок, уцекачы з выбачэннямі забраліся ў чужое пракуранае жыллё.

— Ціха, тапак няма, абутак здымаць не трэба, і святла не запальвайце. Мяне баба Таня клічуць, — для надзейнасці зачыніўшы сталёвыя дзверы на рыгельную завесу, жанчына вярнулася ў пакой. — Вось і хвала Богу, што паспелі заскочыць. Дзівіцеся, што там дзеецца. Толькі не высоўвайцеся.

Насця бачыла, як у двор забеглі чалавек дваццаць, хлапчукоў, хлопцаў і дарослых ужо мужчын. Усе замітусіліся, шукаючы выхад; яна бачыла, што ён наперадзе, між дамамі, але ўнізе, напэўна, гэта было цяжка разабраць.

Чорныя паказаліся з аркі раптоўна — і адразу пачалі страляць у тых, каго бачылі. На дзіцячай пляцоўцы крычалі і курчыліся двое, адзін у пясочніцы, другі ўпаў на пластыкавую горку і ўсё спрабаваў падняцца. Трэцяга паднялі таварышы і пацягнулі падалей.

— У каго ліхтар? Пашукайце, яны далёка не маглі сыйсці.

— Камандзір, тут сплашняком прахадныя двары, а далей прыватны сектар, там, яшчэ чаго, і са стрэльбы могуць пальнуць, а то і з дзедавага шмайсера паласнуць.

Чорныя зверху былі падобныя да нейкіх нечалавечых фантастычных істотаў і неахвотна паварочвалі галовы. Насця магла паклясціся, што чула, як яны па-жывёльнаму ўцягваюць у сябе паветра, вышукваючы здабычу.

— Таварышы, таварышы, — заскрыпеў старэчы голас з адкрытага акна ў доме насупраць.

Чорныя разам павярнуліся да яго, двое паднялі стрэльбы.

— Таварышы, не страляйце, я свой… з адстаўнікоў! Не страляйце, — заныў нябачны стары.

— Што сказаць хацеў, дзед?

— А чалавек некалькі скразанулі ў другі пад'езд чацвёртага дома.

— Ты, стары казёл, не разумнічай, ты рукой пакажы, у які пад'езд уцяклі.

— Ды ўнё… у той, здаецца, таварыш. Далекавата ж, ды і падслепаваты я.

— Вось жа, казліна вохраўская, — адазвалася гаспадыня кватэры, — я табе заўтра асабіста бельмы выцарапаю!

— Доўжык і Пекаль! Праверце, толькі акуратна, а то і сапраўды яшчэ хто-небудзь з кватэры пальне. А табе, дзед, дзякуй за дапамогу.

Параненыя ўжо не крычалі, той, які на горцы сядзеў, абхапіў галаву і ледзь чутна стагнаў, а другі, скруціўшыся абаранкам, енчыў.

— Хамутка, выклікай аўтазак. Ды сціхні ты, сука! — камандзір з усяго маху ўдарыў нагой па галаве небараку ў пясочніцы. — Я цябе зараз навучу і ўладу любіць, і прэзідэнта паважаць. — Кожная яго пагроза суправаджалася ўдарам берца. — Колькі табе, сука, заплацілі? Колькі? Адказвай?!

— Камандзір, пад'езды ўсе зачыненыя, дзверы жалезныя.

— Гэй, уроды, прэч з нашага двара! — выбегшы на балкон, загрымела пракураная бабуля. — Людзі, вы што — зусім ачмурэлі, чаго за шторамі хаваецеся? Сабакі ў наш дом прыбеглі, чаго маўчыце? — Амаль ва ўсіх вокнах загарэлася святло. З пад'езду пачалі выходзіць мужчыны — хто з чым.

— Вон, свалата!

Чорных было ўсяго пяцёра, і яны паспяшалі рэтыравацца. Пабітых забрала хуткая.

Развітаўшыся з бабай Таняй, якая ўадначас стала гераіняй двара, Насця пайшла да мамінай

Чорныя паказаліся з аркі раптоўна — і адразу пачалі страляць у тых, каго бачылі. На дзіцячай пляцоўцы крычалі і курчыліся двое, адзін у пясочніцы, другі ўпаў на пластыкавую горку і ўсё спрабаваў падняцца. Трэцяга паднялі таварышы і пацягнулі падалей

знаёмай Антаніны Міхайлаўны, якая жыла побач.

— Ты дадому патэлефанавала? Маці, мабыць, вочы ўсе выплакала, — прылашчыўшы ката́, спытала жанчына.

— Не, ні Косціку, ні маме. Зараз патэлефаную. Дзіўна, і мне ніхто не тэлефанаваў…

Дзяўчына паспешліва зняла са спіны маленькі рукзачок са скурзама, разадраны ў цэнтры.

— Што за фігня? Здаецца, ні за што не чапляласяʼ… Вось чорт! — Дзясяты айфон быў сагнуты і пабіты, з яго тырчэлі нейкія дэталі. Касметыка покоцана. На дне яна знайшла шарыкі, здзіўлена пакруціла ў пальцах.

— Гэта не мой…

— Думаю, што ўжо твой, роднай дзяржавай падораны. Тэлефон сама купляла ці хто падарыў?

— Косцік, ну і я крыху дадала. Ён яшчэ пажартаваў, маўляў, першая сумесная пакупка, трэба запомніць.

— Вось гэтая сумесная пакупка і выратавала цябе, дзеўка, ад інваліднасці: калі б не было яе — пераламалі б табе пазваночнік клапатлівыя ахоўнікі парадку.

Раніцай вярнуўся дадому сын Антаніны Міхайлаўны — і адвёз Насцю.

Маці, вядома, дала добрага наганяю. Але ёй было не да гэтага: яна шукала свайго Косціка. Ніхто нічога не ведаў. Службы пасылалі адна да адной. МУС і СІЗА па тэлефонах даведак не давалі. У Акрэсціна ён не значыўся, у Жодзіна дабіралася на маршрутцы. Нейкая жанчына, ужо ў гадах, у чарзе ля турмы параіла ёй наогул не совацца і, калі і ездзіць, то толькі з ягонымі бацька́мі, а то, глядзі, яшчэ як малагодку заграбуць за бадзяжніцтва. Усведамляючы сваё бяссілле, яна ўпрасіла маці пагаварыць з бацькамі, які пасля сустрэчы з Косцем катэгарычна заявіў, што яна ніколі не выйдзе замуж за гэтага недабітка ворагаў савецкай улады.

Канстанціна знайшлі ў хірургіі бальніцы хуткай дапамогі. Яго толькі ўчора перавялі ў палату пасля рэанімацыі.

Палата была добрая, на траіх, але занятыя былі толькі два ложкі, ён ляжаў злева. Яна не адразу і пазнала яго. Забінтаваная галава, прыкрытыя правае вока і правае вуха. З адзінага вока на няголеную шчаку каціліся слёзы. Насця, прыціскаючы да сябе пакет з перадачай, ледзь не ўголас зараўла і апусцілася каля ложка на калені.

— Гэй, гусі лапчатыя, вы што тут — паплакаць вырашылі? Ану — перакрылі вадаспады і хутка цалавацца, — падсоўваючы да дзяўчыны табурэтку, прабасіў сусед з загіпсаванай нагой. — Ты толькі глядзі — яго моцна не прыціскай, у яго там катэтар, а гэта справа паганая. Давайце, чмокайцеся, зялёныя, а я паскачу — покуру, каб вас не бянтэжыць.

Насця рашуча па-дзіцячы кулакамі выцерла слёзы і прытулілася да салёнага роднага вока.

— Насцёна, ды пакладзі ты гэты бязглузды пакет у тумбачку. Як у вас там справы? Хаджу пакуль толькі з сястрычкай, так што да тэліка не дапінаем, тэлефона няма, недзе згінуў. Табе спрабую тэлефанаваць — не адказваеш.

— Усё добра. Куды ты знік — там, на Машэрава? Я думала, за гэтыя дні з глузду з'еду…

— Куды-куды, вось больш кучаравую знайшоў, ды, бачыш, не дабег: бацька твой ледзь ногі не пераламаў. Жартую, жартую… Са мной усё нармальна: калі з рэанімацыі перавялі, то жыць буду. Вока вось падбілі, але доктар кажа: бачыць будзеш, малады, можа, і адыдзе. Вуха кавалак адарвалі… Мала таго, што касавуры, дык яшчэ і з драным вухам. Вось як… памітынгавалі. Словам, разы з тры ў мяне патрапілі, а потым нагамі адмяцелілі. Там у мяне самая непрыемнасць… — Кастусь паказаў на ніз жывата. — Доктар спадзяецца, што дзеці будуць. Моцна ж пабілі, ой моцна, увесь сіні, я нават і не ўяўляў, што ў нас так таўкуць. Усё, расказвай, што там?

— Горад бурліць, людзі на вуліцах усе шчаслівыя, абдымаюцца, міліцы не відаць. Толькі мне не весела. Віцьку Пацана памятаеш?

— Памятаю, ён са мной паступаў, толькі ў мянтоўскую групу.

— Ён павесіўся…

— Як?! Ён жа талковым мужыком быў і на бокс хадзіў!

— А ў іх, Верка Бараноўская распавядала, уся група заявы на перавод напісалі, а ён чагосьці тармазнуў, прынёс, а ўжо познa: ці курсанцкую форму апранай, ці ідзі ва ўнутраныя войскі салдацікам. Яго знаёмыя баніць сталі, з фрэндаў павыкідалі, нават тэлефоны заблакавалі, вось ён і не вытрымаў.

— Шкада хлопца. Во які замес пачынаецца…

Пару разоў у палату ўжо зазіраў сусед, заходзіла санітарка.

— Насцёна, давай буськацца — і чакаю цябе заўтра, цяпер кропельніцы пойдуць, працэдуры.

— Добра, там у пакеце пірог, морсік з парэчкі і тэлефон, новы з новай сімкай, нават нумароў агульных табе панабівала. Да тваіх у Горадню так і не датэлефанавалася?

— У іх усё нармальна, жывыя-здаровыя, на сутках у турме. Вось ты звязалася з сямействам… Ты моцна падумай…

— Косцік, а мой бацька сапраўды лютаваў? Ты не памыліўся? Толькі не кажы, што жартаваў, былі б бачныя абодва вокі… Можа, і схлусіў бы, а адно не пракатвае.

— Я табе гаварыць не хацеў… Біў ён людзей і на вуліцы, і ў райаддзеле. Азвярэла біў. Мяне ж у бальніцу з Акрэсціна адправілі, а я як голас ягоны пачуў — адразу здагадаўся, хто гэта, а потым і татушку ўбачыў на правай руцэ паміж вялікім і ўказальным пальцамі — КАТ. А што гэта абазначае?

— Яго ініцыялы. Але ён і ка́там ганарыўся. Маму шкада… Заўтра прыйду.

Насця да начы блукала па раёне і ўсё не магла прыдумаць, што ёй рабіць, як жыць далей. Яшчэ дзіцячая душа назойліва ныла і прасіла слёз, але яны, як на зло, не ішлі. Пайсці і застрэліць бацьку? Яна ведала, дзе ў яго ляжаў «левы» пісталет, — але навошта? Ён і так ужо даўно памёр, вытанчылася і ператварылася ў прах яго душа, напярэдзе толькі лютая адзінокая старасць.

Яна спынілася каля царквы. Таўсматая жанчына замыкала на ключ дзверы. Да Бога сцежку не замкнуць. Дзяўчына рэзка павярнулася і ўпартым крокам пайшла да прыпынка. Праз паўгадзіны яна ўжо ва ўсю гаспадарыла ў Косцікавай кватэры. Патэлефанавала маме на працу (яна сёння была на сутках адміністратарам у адной з новых гасцініц). Косцік патэлефанаваў сам, узрадаваўся, што яна дома. У той вечар пасталелы чалавечак прыйшоў да немудрагелістай высновы: лепш за ўсё самае галоўнае блізкім гаварыць па тэлефоне — менш хваляванняў…

Напрыканцы тыдня ў першай гарадской бальніцы хуткай дапамогі з'явілася новая зусім маладзенькая санітарка, а выдатніца 124-ай школы забрала дакументы і падала іх на першы курс медыцынскага каледжа, дзе працавала адна з усюдысных мамчыных сяброўак.

У першае самастойнае начное дзяжурства Насця, стомленая і да немагчымасці стануўчая, зазірнула ў палату да Кастуся. Асляпляльнае сонца толькі пачынала свой звыклы шлях, змываючы колішнюю брыдоту са стомленых ад бяспраўя плошчаў і вуліц старадаўняга горада, расхінаючы свае прамяні дабра для кожнай светлай душы. Дзяўчына зніякавела ад апантанасці радаснага святла і нечакана ўбачыла ў шкле паўраскрытага акна адлюстраванне свайго шчаслівага, спакойнага і роднага ёй чалавека.

— Мы перамаглі цемру, і гэта наш свет, нашая зямля, нашае жыццё! — нечакана гучна вымавіла Насця.



Фота www.24smi.org

«Знак бяды». Няпройдзены ўрок белліту



Наста ГРЫШЧУК,
budzma.by

«Знак бяды», і без таго актуальны сорак гадоў, сёння выглядае анталогіяй страшных паралеляў. Збольшага яны відавочныя. Калі мастацкі тэкст 1982 года да драбніцаў адбіваецца ў рэчаіснасці 2020-га – значыць, калектыўныя траўмы дасюль не загоеныя. Значыць, увесь час мы рабілі выгляд, што гэта – не з намі і не пра нас. Такі сабе няпройдзены ўрок белліту...

Вось думкі Сцепаніды, галоўнай гераіні аповесці. «*За гэтыя два месяцы яна зразумела, што ад усяго не засцеражэшся, як ні туляйся, а яны калі захочуць, дык знойдуць і прыдзяруцца. Тым болей, што ў немцаў знайшліся ўжо і памагатыя з мясцовых...*».

Да жніўня 2020 года большасць беларусаў верыла ў сілу закона. Яшчэ ў чэрвені адзін з кандыдатаў у прэзідэнты, адказваючы на пытанне, што будзе, калі яго арыштуюць, са шчырым (ці добра ўдаваным) здзіўленнем пацікавіўся: а за што мяне арыштоўваць?..



Ілюстрацыя Арлена Кашкурэвіча да кнігі Васіля Быкава «Знак бяды»

За гэтыя два месяцы толькі самы наіўны не зразумеў: закон не працуе. Нават у той сціплай меры, з якой мы раней мірыліся. Цяпер не ўратуе не толькі пазіцыя «мая хата з краю»; «мой дом – мая крэпасць», – таксама філасофія хібная. У сталінскія часы «варанкі» прыязджалі пераважна па начах – сённяшнія карэты «справядлівасці» раз'язджаюць пры дзённым святле. Жонак хапаюць на вачах у мужоў, маці – на вачах у дзяцей, проста на вуліцы.

«*Яна не ведала іхніх парадкаў, не хацела іх парушаць, але хто ведае, за што яны могуць прычапіцца да мірнага чалавека*».

Хто ведае.

Тую ж небяспечную, бо падманлівую, філасофію спавядаў муж Сцепаніды. «*Нічога, як-небудзь, – сказаў Пятрок. – Мы перад імі невінаватыя. А калі з імі па-добраму, дык, можа, і яны... Не з'ядуць, можа...*»

Трагічная вера, якая прывядзе да смерці героя. Чытаючы ў 2020-м гісторыю з 1942 года, мы гэта выразна бачым. Спачуваем, прадчуваем бяду.

І ў той жа час сёння, пасля зверстваў на Акрэсціна, знаходзяцца людзі, якія вераць: я невінаваты, я не выказваў нязгоды, мяне не крануць; а тых, каго білі, – іх, відаць, было за што. Свежы прыклад – інтэрв'ю Генадзя Аўсяннікава, купалаўца, які сказаў, што пратэстоўцаў ёсць за што затрымліваць. Таго самага Аўсяннікава, які дзесяцігадоў граў на адной сцэне з Генадзем Гарбуком, які, у сваю чаргу, граў Петрака ў экранізацыі «Знаку бяды». Якая горкая іронія.

Мне надзвычай цікава, што сказаў бы Пятрок, аказаўшыся ў нашым 2020-м, дзе нямецкіх акупантаў няма, іх 75 гадоў як «пабядзілі», а паліцаі так нікуды й не падзеліся. Яны, беларускія сыны, з ніжэйшых чыноў дайшлі за паўстагоддзя да самых высокіх. Занялі, так бы мовіць, усю вертыкаль.

А яшчэ я думаю вось пра што: Пятрок, уражлівая душа, вельмі б здзівіўся, пачуўшы, як беларуса называюць фашыстам за тое, што ён беларус. Прычым тыя самыя паліцаі і называюць.

*

Калі на хутары Багацькаў пасяліліся немцы, Сцепаніда памкнулася хаваць карову, свінчо і курэй. Не ўсё атрымалася, і, не жадаючы аддаваць малако немцам, Сцепаніда выдаіла карову проста ў зямлю.

Пра гэты тып народнай барацьбы пісаў журналіст «Моцных навінаў» Пётр Кузняцоў. Сыходзячы ў лес ад ворагаў, беларусы забіралі з сабой карову – ні кроплі ворагу. Цяпер іх нашчадкі здымаюць грошы з банкаўскіх рахункаў: ад пачатку года – 2,5 млрд даляраў.

Трансфармаваліся і заклікі «акупантаў» паведамляць пра дзеянні «бандытаў». Вы здагадаліся: размова пра славутыя паведамленні ад МУС, у якіх сумленных грамадзян просяць паведаміць пра падазроных асобаў, што парушаюць грамадскі спакой. Народ імгненна адрэагаваў з'едлівым каментарыем: «Парцізанэн, здавайся!».

*

Сам таго, безумоўна, не ведаючы, Быкаў у 1982 годзе патрапіў у сутнасць мірных жаночых пратэстаў у сучаснай Беларусі: «*Яна іх не баялася, бо не паважала іх. Болей таго – яна іх ненавідзела. Зрэшты, ёй не было да іх справы, у тым жыцці, якое абрынулася на свет, яна адчувала перавагу сваёй спрадвеку ўстаноўленай праўды і, пакуль у яе было тое адчуванне, магла смела глядзець кожнаму ў вочы*».

Здымкаў, на якіх жанчыны глядзяць у вочы карнікам, болей чым дастаткова. Як і фота, на якіх жанчыны выглядаюць не запалоханымі, не вінаватымі, не зламанымі, але поўнымі пачуцця ўласнай годнасці.

*

«*Жылі людзі да гэтай вайны і, мусіць, будуць жыць і пасля, а во ці давядзецца жыць гэтым, яшчэ невядома*». Так думала Сцепаніда, разважаючы пра будучыню акупантаў.

Людзі ў сэпках, перад калючым дротам, каля аўтазакаў не раз задавалі пытанне сілавікам: «Што падумаюць вашыя маці?..». Тоеснае пытанне: як вы будзеце жыць пасля?..

Пытанне, ці будуць яны ўвогуле жыць, не гучыць – пратэст у нас мірны. Але партызанскі гнеў праявіў ужо сябе: дэананімізацыя, дошкі ганьбы, парэзаныя колы аўто і нават спалены дом. Невядома, ці задаюцца тымі ж пытаннямі самі сілавікі, але пра штосьці такое яны ўсё ж задумваюцца: пра гэта сведчыць вялікі страх застацца без маскі.

Я сама была сведкай таго, як на плошчы Свабоды жанчына сарвала балаклаву з амапаўца. У адказ ён ударыў яе – з размаху, азвярэла. На твары ягоным застыла дзіўная грымаса, і я доўга не магла ідэнтыфікаваць гэтую скамянелую эмоцыю. Цяпер зразумела: гэта быў страх. Знянацку застаўшыся без звыклай абароны, амапавец зрэагаваў жывёльным інстынктам «бі!».

У гэтага страху ёсць яшчэ адна прычына, па-за народнай помстай. Ключ да яе – наступная сцэна ў «Знаку бяды». Паліцай Гуж на вачах у Петрака атрымаў дзве аплявухі ад нямецкага афіцэра – ад умоўна «свайго». Аказваецца, калі пераходзіш на бок моцнага, гэта не робіць моцным цябе. Ты застаешся чыімсьці харчам у ланцужку дзікай прыроды.

«Красаўцы», якім дзякаваў Лукашэнка, – таксама. Мітынгоўцы, стоячы перад блокпастом каля Палаца незалежнасці, так і казалі ім: ён вас кіне. У верталёце мала месца. І верталётаў мала.

*

«*Крыж пастаяў вясну і лета – на самай выспе над лесам і ровам, воддаль ад дарогі. Кожны, хто ехаў ці ішоў гасцінцам, пазіраў на гэты знак чалавечай бяды, але мала хто ведаў, якая была то бяда*».

Тым і замінаюць Курапаты цяперашнім пакуль што ўладам: кідаюцца ў вочы. Псуюць выгляд кальцавой. І не толькі ўладам: вандалы валілі крыжы, разбівалі лаўкі; на мемарыяле ў Курапатах, які толькі былі адкрылі, у лічаныя дні з'явілася фашысцкая свастыка – старанна выдрапаная па свежым метале. Ці трэба казаць, што вінаватых не знайшлі?

Крыж – не толькі знак чалавечай бяды. Ён – напамін пра злачынства, які злачынцу хочацца сцерці з твару зямлі і свайго аблічча.

Што сталася з крыжам, які Пятрок паставіў на сваёй асабістай Галгофе, зямлі, якая знясільвала? Прыйшлі двое камсамольцаў. Спілавалі. А потым прачыталі лекцыю пра шкоду рэлігійнага дурману.

У Беларусі 2019 года абышлося без лекцый, аднак зялёныя байцы лягсаса ламалі курапацкія крыжы на велікодным тыдні.

*

Ёсць у «Знаку бяды» і свой мукавозчык. Дзікаваты недалуга Патап Каландзёнак, які знайшоў прымяненне сваім талентам у журналістыцы – калі толькі можна так назваць стукацтва. Каландзёнак напісаў у газету нататку з выкрыццём «кулакоў» – аднавяскоўцаў, якія карысталіся наёмнай сілай. Напрыклад, адзінокая бабуля, якая не мела сіл апрацоўваць зямлю і звярталася па дапамогу да іншых. Тут цяжка не згадаць жанчыну з Гродна, якая, адпрацаваўшы сумленна ўсё жыццё, такі дазволіла сабе – з дапамогай сына – збудаваць дом. А потым трапіла ў выкрывальніцкі сюжэт дзяржаўнага тэлеканала.

Што да Каландзёнка, ён атрымаў мянушку Селькор, а потым стаў паліцаем.

*

Гэта самае цікавае ў творах Быкава, у тым ліку ў «Знаку бяды», – раскрыццё псіхалогіі паліцая.

«*Я цяпер чаму сюды прыбіўся? Думаеш, немцам служыць? Чхаў я на немцаў. Мне трэба расчытацца з некаторымі*».

Гэтак кажа паліцай Гуж з раскулачанай сям'і. Пры пэўнай чуласці можна было б праякнуцца якім-ніякім спачуваннем да персанажа, маўляў, помста, балотная вендэта. Але не спяшайцеся.

Яму не трэба зямлі. На пытанне, для чаго Гуж гэтак стараецца, ён кажа: «*А хоць бы за тое, што ўладу далі. Дзеля ўлады! Я ўсю жысць быў падначалены, малы чалавечак. Усяго бойся. А цяпер у мяне ўласць! Поўная. Я ж для вас цяпер вышэй, чым сельсавет. Вышэй, чым райком. Чым саўнаркам нават. Я ж магу любога, каго хочаш, стрэльнуць*».

Напрыклад, бяззбройнага Аляксандра Тарайкоўскага. Або Генадзя Шутава. Альбо стрэліць у журналістку, якая знаходзіцца ў зоне пратэстаў па працоўным абавязку.

Маналог Гужа раскрывае подлую натуру баязліўца, якому ўлада патрэбная, каб пацвердзіць сабе самому права на існаванне. Ён пазбаўлены чалавечай годнасці, ён не ведае любові, ён сам сябе ненавідзіць. Каб давесці, што маеш месца пад сонцам, мусіш нішчыць іншых – вось яго звыродлівая логіка.

Адваротны тыпаж – паліцай Недасека. Малады, нязлосны, нават кранальны. Чаму ў паліцаі пайшоў? Што зробіш, брат – савецкі актывіст, з такімі родзічамі нядоўга стаць да сцяны. А ў яго, у Недасекі, дзеці. Усё для дзяцей.

Сцепаніда нават пашкадавала яго. А потым запытала: ты ўжо вешаў каго-небудзь? Не, адказаў кранальны Недасека, і не хацелася б. Але калі скажуць – «Скажуць, дык што ж. Мусіш». Хоць бы і роднага брата. Што зробіш, калі загад.

Так і казалі ваенныя злачынцы ўсіх часоў і народаў: што зробіш, калі загад. І мы аднойчы пачуем тое ж самае.

Вось дзве крайнасці: недасекі з нулявой персанальнай адказнасцю, аморфныя істоты з ружжамі – і гужы з адчуваннем поўнай улады й непадлегласці суду. Абедзве крайнасці – бакі аднаго медаля. Страху.

«*Сцепаніда болей не казала нічога, толькі слухала яго блытанае апраўданне і думала, які ж ён дурны, а можа, і подлы. Не спагадлівасць да яго хутка выяснялася злосцю, і яна думала, што такіх не навучыш, нічога ім не зразумець, бо далей свайго карыта ім не дадзена бачыць. Такія ад прыроды сляпыя да маленькага пробліску чалавечнасці, дбаюць толькі аб сабе і апраўдваюць дзецьмі. Божа, што будзе яшчэ з тых іхніх дзяцей, што яны пярэймуць ад гэтых во таткаў?..*»

*

Фінал «Знаку бяды» вядомы: Сцепаніда коштам уласнага жыцця адстаяла права самой вырашаць свой лёс. Яна abліла сябе газай і падпаліла. Загінула не толькі гераіня, загінуў цэлы свет – яе хутар.

18 верасня ў Смалявічах да будынка РАУС падышоў мужчына, абліў сябе бензінам і падпаліў. Мужчына загінуў.

Я не маю права выказваць здагадкі пра матывацыю гэтага чалавека.

Але я магу патлумачыць, чаму Быкаў абраў для сваёй гераіні такі фінал. Таму што «той, хто аднойчы адчуў сябе чалавекам, ужо скацінай не стане».

У гэтым сказе – галоўнае для нас сёння. Беларусы, якія ўрэшце пераступілі парог тутэйшасці і абвясцілі сябе беларусамі, адчулі сябе грамадзянамі і зразумелі, што разам у іх – у нас – ёсць сіла перамагчы («Мы непобедимы, пока мы едины»), ужо не вернуцца да стану абыякавага насельніцтва, да ганебнага стану «элехтарату».

*

Адно пытанне непакоіць: што скажуць дзецям пра «Знак бяды» школьныя настаўнікі літаратуры?

Не гасі ліхтара…



Анатоль ІВАШЧАНКА

Разлом

Мяжа незваротна пяройдзеная.
Ззаду дыміцца разлом
між тым, што (закрэслена) «Родина»
і тым, што (капслокам) — лайно.

Донца глядзіцца ў ваконца.
Вядзем з апраметнай стрым.
Тралейбус «Дразды — Маконда»
чакае ў дэпо старым.

Палае нябесная лесвіца.
Як даводзіў Хрыстос,
дзеля таго, каб узнесціся,
не варта ўзрываць хмарачос.

Як даводзіў Сідхартха,
прыхільнасці гэта зло.
Сядзець ў вірасане па хатах
ды сузіраць разлом.

Зноўку камусьці патрэбныя
гэтыя песні-рэпіты.
Хтосьці ліе кулі срэбныя,
нехта тчэ пояс шахіда.

* * *

перарэзаныя лёсы
перакроеныя жыцці
перабітыя імёны
й закатаныя ў асфальт
перакручаныя словы
перагрушчаныя гукі
зацугляныя пачуцці
і забітыя амаль
усё меней тут паветра
усё болей тут атруты
ў халуйскіх сытых пысах
рабалепства тупасць страх
абылганыя прарокі
зацкаваныя героі
толькі душы не задушыш
толькі думкі…
неяк так

Замова

Цмок стары п'е кроў здаўна,
не насмокчацца ніяк.
Ад відна і да відна…
Ненажэрны ваўкалак.
Клешч хутка лопне, лопне, лопне,
звар'яцелы крывасмок.
Клешч хутка лопне, лопне, лопне,
і развіднее, й сыдзе змрок.

Карнікі

Чорная навала
на маёй зямлі.
Ў масках-балаклавах
нелюдзі прыйшлі.
Навалач без сэрцаў.
Нечысць без крыжа.
Карнікі ў берцах
чыняць безмяжак.
Пад бранёю вашай
не схаваць хвастоў.
Забірайце сашу
and go to Rostov.

Пераможам

Ад таго, што наўкола,
няпроста не страціць розум.
Словы рэжуць горла,
па сэрцы ідуць барозны.
Пацукоў ванітуе,
іх човен трасе.
Але здрыснулі з борта
далёка яшчэ не ўсе.



Фота www.torange.ru

Можа, моцныя ды смелыя
ўсе
закапаны ў полі?
Бел-чырвона-белыя
душы
равуць ад болю.
Выбух. Святло.
Ціша.
І…
новы гук.
Гэта недакладна, але
нараджаецца пацук.
Жывіцца праклёнамі лжывы
псіхапат.
Ў белых палітонах стратэгі.
Шах і мат.
Ружы нашыя
ператворацца
ў ружжы раптам.
Нават херувімы цяпер
размаўляюць матам.
Гэтыя радкі, імаверна,
начынены тратылам.
Ключык залаты
Тартыла
зжэрла ды забыла.
Гэтыя радкі, верагодна,
прапітаны напалмам.
Моцныя ды смелыя,
мы
пераможам малпаў…

* * *

Не блытайце героя лірычнага
з аўтарам,
нават калі ў іх адзін творчы метад.
Блытаць няварта фюрэра з фатэрам,
нават калі вы прапісаны ў гета.
Не блытайце турызм з эміграцыяй,
сябры,
як раяць змагары.

а ў бары, бары
удзень — авадзень
ўвечары — камары
кінуць вечны плач
кпіны бульбасрач
памяняць ландшафт
завяршыць гештальт

а ў бары, бары
заселі ціхары
гэй, гэй, гэй-гэй
мары-камары
гэй, гэй, гэй-гэй,
бабарыбары

Адрынутыя

Паўлу Севярынцу

Адрынутыя —
ты,
я,
мы.
На вуснах патрэсканых
прысмак зімы.
На вуснах скрываўленых
прысак вайны.
У лоб дубальтоўку наставіла восень.
Бы высыпкі воспы
на целе радзімы, —
«хіміі», зоны, астрогі.
Гуглі ні гуглі —
не знойдзеш дарогі
да пункта з назовам Куплін.
Халодныя вочы
няўтульныя зімы.
Пачварныя плямы
на целе радзімы.
Няўтульныя вочы,
халодныя зімы.
Плямы — мы.
Нас тысячы.
Ты сячы,
а мо й мільёны.
Ззяюць знічы
сярод гэтай начы.
Цэлы народ замкнёны.
Колькі такіх,
каго без віны?
Ўшчэнт, падыспад,
у тыя віры…
Ці маецца дно
у глыбіні?
«Хімік» —
гэта ж ад «схімніка»?
З узбочыны скрушна
тарэшчыцца крушня.
Вось сімвал сцюдзёнага выраю.
Заўважана слушна.
*God, where are You?**

Яны адграбуць, Паша, помні
па поўнай.
Хоць тое й не наш,
хрысціянскі, метад.
Але ж адграбуць, Паша,
ведай.

* Божа, дзе Ты?

2012

Аблокі

Алесю Юркойцю

А недзе наверсе лятуць аблокі,
а дзесьці над шэрасцю — ясны блакіт.
І цяжка паверыць, што з гэтай аблогі
ёсць вызваленне, што сыдуць снягі,
што новае неба па-над смугою
заззяе бурштынам сакавіка…
І усміхнецца ранак герою.
І ён усміхнецца ў адказ.

Бэтмэн вяртаецца

Лісце з бязвыйсця пад колы кідаецца
клёны з праклёнамі ў шыбу ўзасмок.
Ляскае горад сталёвымі сківіцамі,
фары ўгрызаюцца ў чэзлы паўзмрок.
Бэтмэн вяртаецца з бэтлу пад раніцу
ў свой запляваны цёмны пад'езд.
Слізгае ў фортку дзеўчына-котка,
зрэшты, цяпер крыху не да яе.
Ўсё у парадку. Айфон — на зарадку.
Піва ў лядоўню, крылы ў кут.
Выхапіць поўня надпіс няроўны
маркерам чорным:
«LU.. НА МУКУ»
Бэтмэн кладзецца ў ложак астылы
з веданнем пэўным: хутка гамон
прыйдзе рэжыму, й ні Джокер з Пінгвінам
не ўратуюць, ні НКУС, ні АМОН.

Спіце ж спакойна й вы, гараджане.
Волі світанне не за гарой.
Цемра растане. Паспі й ты, кажане.
Хутка на працу,
супергерой.

Коля Малфой ідзе ў школу

З лістоў да Луцыуса

Ты праўда думаў, Луцыус, што гэта была добрая ідэя?
Хогвартс? Ты сур'ёзна?
Аддаю даніну тваймy высакароцтву:
цябе не засмуціла, колькі майданутых паўкровак
будзе вучыцца побач з тваім хлопчыкам…
(Табе, вядома ж, дакладалі і пра Мірона Потэра, і пра іншых крымінальнікаў, тваёй бязмежнай літасцю выпушчаных з Азкабана.)
А як быць з тым нажом у спіну ад гэтых няўдзячных нягоднікаў грыфіндорцаў,
тваімі грудзямі ўскормленых?!.
Так, ты прыставіш да хлопчыка двух дэментараў,
Пажыральнікі будуць забяспечваць
пільную ахову ад заклёнаў
на іх гнюснай гаворцы,
Міністэрства магіі, вядома, выдасць асаблівую пастанову ўставаць
і замружвацца
пры з'яўленні Малфоя малодшага
(ну, а некаторымі асабліва гаваркімі чальцамі Ордэна Фенікса хай займаецца іншае Міністэрства)…
І ўсё ж пагадзіся, Луцыус,
гэта памылка.
Паглядзі, нават Валдэморт
Валдэмортавіч,
сам Цёмны Лорд наклаў на сваіх чадаў абаротныя заклёны,
каб ніхто не знаў, не ведаў.
Так, Хогвартс — найлепшая школа
чарадзейства,
але падумай, Луцыус,
ці навучаць там карыстацца чароўным дручком
паводле яго прамога прызначэння,
не кажучы пра забароненыя там «Авада Кедаўра»?..

Дарэчы, вайсковая форма хлопчыку дужа пасуе!

Твой,
Хрэніус

Рыбацкая надзея

Рыбацкая надзея
не чэзне, не марнее,
не гасне на дажджы,
ад ветру не дрыжыць.
Рыбацкая надзея
з гадамі маладзее,
не слепне ад сляпня,
шаршня ды авадня.
Рыбацкая надзея
у цёплым іле млее.
Ці дрэмле пад карчом
двухкілевым ляшчом.
Рыбацкая надзея
пільнуе далячынь.
Шапоча чаратамі
ды срэбнымі хвастамі
паблісквае ўначы.
На кончыку плыўка,
ў трываласці садка,
у тэрмаску з пярлоўкай
да першае паклёўкі…
Яна жыве датуль,
жывы рыбак пакуль.

* * *

Не гасі ліхтара
у вакне,
калі нават у сэрцы імгла,
калі ўсё — у густым тумане́,
не гасі у вакне святла.
Не гасі у вакне ліхтара,
калі нават вайна
у вакне,
калі ў сэрцы імгла і страх.
Не гасі ліхтара.
Для мяне.



Васіль БЫКАЎ

На чорных лядах



Фота www.pinterest.com

Называецца — даваяваліся!..

Тое, што яны даваяваліся дарэшты, да астатняй магчымасці, камандзір зразумеў не цяпер і не ўчора, як іх прыціснулі да ракі і секлі ў кустоўі з кулямётаў, а яны толькі агрызаліся рэдкімі вінтовачнымі стрэламі. І нават не тыдзень таму, як змардаваныя, галодныя, невялічкаю групай, рэштаю батальёна туляліся па лесе, не ведаючы, куды паткнуцца, дзе раздабыць правіянту, табáкі, пару начных гадзін адпачыць у спакоі. Іх трагічную нявыкрутку камандзір выразна адчуў ужо на пачатку вясны, як стала зразумела, што гэты раён абкладзены з усіх бакоў — ва ўсіх блізкіх і далёкіх вёсках, на хутарах і фальварках поўна чырвонаармейцаў, якія браліся за іх няспешна, абачліва, грунтоўна. Тыдзень таму іх выкурылі з наседжанага хваёвага грудка ля балота, не далі перайсці рэчку ў суседні раён, яны ледзьве адарваліся ад цэлага палка чырвоных. Увесь дзень учора бахала-трахацела на тым баку лесу, спярша гучна тахкалі стрэлы, гайдалі лясное рэха кулямётныя чэргі, а пасля, пад вечар, усё неяк неўпрыцям сціхла. Мяркуючы па ўсім, прыйшлі кранты і на групу Улашчыка, якая спрабавала атабарыцца ў тым баку лесу. Значыцца, і там не было паратунку, як не было яго тут, каля Морачы, як не было ў гэтых лясах, у акрузе — па ўсёй Беларусі. Яшчэ ўзімку, седзячы ў заснежаных лесавых нетрах, яны спадзяваліся ператрываць халады, дачакацца вясны, калі, можа, яшчэ ім пашчасціць. Ды не пашчасціла. Па цяплу, па зялёнай траве і тым стала лацвей, і тыя актывізаваліся, згрупаваліся, абкружылі і пачалі паляванне па ўсіх правілах палявой навукі — бы на ваўкоў. Во тады й стала зразумела, што іх дні палічаныя, не сёння, дык заўтра яны ўсе палягуць.

Ад самае раніцы яны аслабела валакліся па лесе, кожны стараўся не дужа адстаць ад пярэдняга, а ўсе разам — ад камандзіра, які то хістка сігаў наперадзе, то спыняўся сярод хваін, слухаў, азіраўся. Азіраючыся, ён паварочваўся ўсім целам, бо не мог паварушыць галавой на збалелай, абвязанай брудным ручніком шыі. Параненая яшчэ на пачатку зімы шыя не гаілася, гніла, рудая жыжа цякла з яе па грудзях, на жывот, павязка заўсёды была мокрая. Навокал пакуль што было ціха і глуха ў гэтым глухім кутку лесу, толькі хваёвы шум слаўся ўгары, мерна гайдаліся хвойныя вершаліны; часам ціха патрэсквала сухое голле пад нагамі тых, хто ззаду аслабела дабрыдаў да пярэдніх. Тады, па чарзе спыняючыся ля камандзіра, усе слухалі, азіраліся, бы штось выглядваючы па баках. Яны не размаўлялі цяпер, ды і даўно ўжо не размаўлялі паміж сабой, бо ўсё было перагаворана, вядома; спрачацца не было пра што. Есці таксама ў іх не было нічога, не было чаго закурыць. З боезапасу засталося ўсяго па два-тры патроны на вінтоўку ды шэсць патронаў у барабане камандзіравага нагана. Гэта і ўсё. Адбівацца ў іх не было чым.

Але добра яшчэ, калі ўсіх пераб'юць. А калі каго возьмуць параненым, непрытомным, павяжуць у горад ды пачнуць вызнаваць, чый, каму якая радня, хто бацькі, жанкі, дзеці? Тады што? Не, яны даўно ўжо ведалі, што пагібель — не найгоршае з усяго, што нарыхтаваў ім іх паўстанцкі лёс. Горш, калі яны, гінучы, пацягнуць на пакуты іншых, тых, дзеля каго, па сутнасці, распачалі ўсё тое. Нават забітымі яны не знойдуць паратунку ад бальшавікоў. Як той Аксяневіч з Курбыкам, што асталіся ля ракі. Забітых іх павезлі ў горад — на апазнанне. Тры дні іх целы ляжалі на фурманцы ля штаба, куды па чарзе ганялі гараджанаў, вяскоўцаў, і нехта іх апазнаў. Апазнаў на гора бацькам і родзічам, якім той жа начы павязалі за спінаю рукі й павезлі. Куды — хто ведае. Таму яны наважыліся. Доўга не абмяркоўвалі, камандзір сказаў, і ўсе пагадзіліся, выйсця ў іх не было. Зброю — вінтоўкі і наган — пакінуць з сабой, а паперы, якія дакументы раніцай сабралі да купы і спалілі ў ядлоўцы. І засталіся без імёнаў і прозвішчаў, без роду-племя — восем абадраных, згаладнелых, аброслых барадамі валацуг, што вырашылі сёння канчаць...

Рабіць тое трэба было як найхутчэй, пакуль тыя з начы, здаецца, згубілі іх след у гэтым лесе, і яны адарваліся ад даганятых, неяк заблыталі на балацявіне сляды і выйшлі ў ціхі лесавы край. Хоць тая цішыня магла быць здрадлівай, кожную хвіліну яны рызыкавалі наскочыць на бальшавіцкі ланцуг ці засаду. Зноў жа доўга брысці ім не выпадала, камандзір ведаў, што тут недзе павінны пачацца Чорныя ляды, а далей, можа, вярсты праз тры, баравы хвойнік скончыцца, пачнецца лугавы прасцяг з дарогай — там ужо, напэўна, іх чакаюць. Ну, але пакуль што, здаецца, ім далі нейкі перадых, у лесавой глушы нідзе не было чутна ні голасу, ні крыку, ні стрэлу. Толькі б нагледзець здатнае месца, якую баравінку, пагорачак. Але ў гэтым раўнінна-забалочаным краі нідзе ніякай баравінкі — спрэс дрымучыя лясныя нетры, бярозы ды сосны, імшарыны, пясчаны, паросты ядлоўцам дол. І яны валакліся, аж покуль наперадзе не паказаўся прагал, зверху шэра засвяцілася хмарнае неба, у доле непадалёк відаць стала нагрувашчанне карчоў, звалочаных сюды з недарасцярэбленых лядаў. Мясціна, вядома, не самая лепшая, падумаў камандзір, але ўжо якая ёсць. Брысці далей было зусім рызыкова.

Ён стаў, паазіраўся. Адразу ж за ім спыніўся і запытальна зірнуў на яго той, што ішоў следам — мажны, хоць і малады яшчэ чалавек са святлява аброслымі шчэццю пашчэнкамі, апрануты, як і камандзір, у доўгі, са скарэлым крыссем шынэлак.

— Што, тут, камандзір?

— Тут.

— Можа б далей?

— Не, далей нельга, Мяцельскі. Можам не ўправіцца. Адна ж рыдлёўка.

Самотны цень мільгануў і прапаў у светлых вачах Мяцельскага — той быў камандзіраў памочнік і цяпер без загаду зразумеў найпершую задачу.

— Казак, давай! — стрымана гукнуў ён таго, хто валокся трэцім у гэтым разбрыдным страі. То быў нізенькага росту, нявідны паставай чалавечак у шэрай паддзёўцы са стрэльбай на рамяні і кароткай, засунутай за дзягу рыдлёўкай. Болей рыдлёўкі ў іх не было ні ў кога. На хадзе вымаючы яе з-за спіны, Казак падышоў да начальнікаў і спыніўся.

— Ну што? Капай!

Без роспыту і лішніх словаў Казак пачаў раскопваць мяккую імшарыну, пад якой апынуўся светлы, амаль белы баравы жвір. Казак быў чалавек паслухмяны, ніколі не пярэчыў начальству, што скажуць, тое і зробіць. Да таго ж зусім негаваркі, болей маўчаў, і ніхто ніколі не ведаў, што яго найболей турбуе. Нават ці турбуе наогул. А мабыць, турбавала, як во цяпер, калі ён дужа хацеў курыць. Есці хацеў таксама, але голад для яго быў пачуццём звыклым, ён намала нагаладаўся за жыццё, але каб не курыць?.. Без табакі ён доўга не мог, ён тады проста маўкліва марнеў, і на абвялым, у рэдкім валассі твары яго была невымоўная пакута.

Увесь гэты жах утварыўся не з іхняй волі — д'ябал ці лёс падвялі іх менавіта да такога выніку. Іншага не выпадала. Іншы быў яшчэ больш жахлівы, з двух жахаў яны выбралі найменшы. Каб толькі давесці ўсё да канца, а там... А там хай жыве Беларусь! Без іх.

Іншыя, пакрысе падыходзячы да гэтай мясціны, спыняліся, моўчкі, з насцярогаю пазіралі ў раскапаны дол, чакалі. Мабыць, усе ўсё разумелі, тлумачыць нікому не было патрэбы. Мяккі, паросты беламошнікам жвір ляцеў з Казаковай рыдлёўкі пад іхныя ногі — на старыя змакрэлыя боты, разлезлыя аўстрыйскія гамашы і нават лапці з аборамі, як на нагах у Дзеда — дужа чорнабародага, з чорнымі густымі брывамі шарагоўца. Не страсаючы абсыпаных жвірам лапцей, той адышоў наводдаль і апусціўся на дол. Галава яго неяк сама сабою ўгнулася, унурыўся позірк, вусны заварушыліся, нібы творачы святую малітву. А можа, і не малітву, можа, ён проста штось гаварыў сабе ці людзям. Разабрацца ў тым, аднак, не было каму, кожны імкнуўся засяродзіцца ў сабе, хіба апроч Кажухара. Гэты меў такое прозвішча, бо некалі шыў кажухі, у адным з якіх, мабыць, быў і цяпер — несамавітай, счарнелай ад вільгаці апратцы з аблезлым каўнярам. За пазухай перад сабой ён ашчадна трымаў правую, тоўста абкручаную нейкай анучай руку. Тыдзень таму на шашы яе добра-такі лупанула бальшавіцкая куля, і цяпер Кажухар дужа пакутаваў. Са скрыўленым ад болю, даўно не голеным тварам ён пазіраў каля людзей ды сеў побач з Дзедам.

— Ну во, братка, як яно ўсё атрымалася...

Яму відавочна хацелася пагутарыць, пабедаваць, каб хоць як заглушыць боль у руцэ, але Дзед не адказаў — таму, мабыць, балела сваё.

«Атрымалася!» — паўтарыў у думках Ігар Забела, што ачмурана стаў насупраць. Трэба б неяк падбадзёрыць сябе, але ў яго проста не знаходзілася для таго словаў. Вусны яго на момант здрадліва скрывіліся, вочы гатовыя былі пакрыцца слязмі. Неяк, аднак, ён намогся, асіліў нечаканую слабасць, цвярдзей сашчапіў голыя юначыя пашчэнкі і адвярнуўся.

Неўзабаве да выразна азначанай у імшаніку яміны падышлі й астатнія; хто стаяў адвярнуўшыся, хто апанурана пазіраў на ўвішнага Казака ці сабе пад ногі. Аўстрыяка нядоўга пастаяў сярод іншых ды, забіраючы паўколам навакол, памалу пайшоў па лесе. Каб стрымаць раптоўную немач, ён пачаў пазіраць угору, між хваёвых вершалін, што ціха і мерна пагойдваліся над голым яшчэ, бязлісцевым веццем бяроз. Недзе там, у глыбіні неба, плылі й плылі шэрыя веснавыя аблокі, што неслі кудысь веснавыя дажджы — на азіміну, пад ярыну, на родныя палі й гоні. Яму ж, Аўстрыяку, ужо не давядзецца выйсці на поле, натрудзіць далоні аб ручкі плуга, удыхнуць хмельны пах ворнай зямлі. А так хацелася... Тое карцела ўвесь час, снілася па начах. Як тры гады гібеў у пацуковых акопах той мікалаеўскай, як галадаў у бараку аўстрыйскага палону. Затым як уцякаў дамоў, прабіраючыся начамі праз чужыя палі й пералескі.

Камандзір, крокі на тры адступіўшы ад ямы, як заўсёды, з засяроджана стрыманым выглядам думаў сваю неадчэпную думу пра гэтых людзей. Цяпер ім патрэбна была якая гадзіна спакою, каб не пашкодзілі тыя. Праўда, пакуль было ціха, але ён не меў ніякай гарантыі, што цішыня задоўжыцца і дасць магчымасць зрабіць задуманае.

Вядома, усё тое было жахліва, не па-чалавечы і не па-боску, напэўна, але што ж ім рабіць? Увесь гэты жах утварыўся не з іхняй волі — д'ябал ці лёс падвялі іх менавіта да такога выніку. Іншага не выпадала. Іншы быў яшчэ больш жахлівы, з двух жахаў яны выбралі найменшы. Каб толькі давесці ўсё да канца, а там... А там хай жыве Беларусь! Без іх.

Напрыканцы ўсяго надта карцела абвінаваціць іншых, тых, каго цяпер тут не было. Але камандзір адчуваў, што не трэба вінаваціць — ні зачыншчыкаў, ні кіраўнікоў. Рабілі ўсе, як умелі, хоць умельства таго й бракавала. І ў кіраўнікоў з'езда, і ў камісара Жаўрыда. Але ўсе — ад шчырага сэрца, дзеля карысці народа. А што да камандзіраў палкоў, дык тыя (можа, за выключэннем аднаго здрадніка) і зусім паводзілі сябе па-геройску, шчыравалі, не шкадуючы ўласных жыццяў. Ды марна, нічога не пайшло на карысць. Усё на згубу. Як заўжды, маса засталася ўбаку, не падтрымала іх Беларусь. А супраць, не памарудзіўшы, выступіла сіла, якую яны, здаецца, не ўлічылі. А галоўнае, змарнавалі самы дарагі час — на размовы-перамовы, узгадненні, паразуменні. На дэмакратыю. А тыя не перамаўляліся, тыя знай білі. Цяпер вось расплачваецца.

Працяг на стар. 12 (6) »

На чорных лядах

« Працяг. Пачатак на стар. 11 (5)

Як заўжды на вайне, галоўная плата — кроў, і плоціць той, хто найменш вінаваты. Як яны тут — былы камандзір роты ды гэтыя дзядзькі-шарагоўцы. А яшчэ хлопчык... Камандзір колькі ні думаў, ніяк не мог пагадзіцца з пагібеллю Валодзькі. І не ведаў, што можна прыдумаць, як схітрыць, каб неяк зберагчы ягонае жыццё. Аднаго з усіх. Якія цвёрда рашылі, калі тое — дык усім разам. Без выключэння. Бо выключэнне знайшлося б не для аднаго. А ім трэба было не пакінуць слядоў. Яно, мусіць, і правільна, і маральна. Ды во гэты падлетак, ён блытаў усе іх лагічныя меркаванні і пратэставаў супраць пагібелі. Ці, можа, гэта ў ім самім бунтавала яго даўняе вучыцельскае мінулае, — хто знае.

Аднекуль здаля, з хвойніку, пачулася трывожнае сарочае сакатанне, пасля яно стала бліжэй, да яго далучылася новае — збоку. Камандзір незадаволена ўглядзеўся ў высокае голле хвояў, і Валодзька тады зглядзеў сарок. Дзве іх зляцеліся разам і, пераскокваючы ў голым суччы бярэзін, сакаталі і сакаталі, трывожачы людзей. Валодзька падхапіў з долу ламачыну, падбег да іх бліжэй і шпурлянуў яе ўгору. Але сарокі толькі пераляцелі на іншыя дрэвы. Хлопец вярнуўся да ямы.

— Не бегай, Валодзька, — ціха сказаў да яго камандзір.

— Раскрычаліся на ўвесь лес.

— Хай крычаць...

Можа, і праўда, хай крычаць, цяпер ужо ўсё адно, абы толькі не паказаліся тыя. Валодзька ўглядзеўся ў лесавыя нетры — быццам нікога нідзе не было, значыць, гэта сарокі — на іх.

Тым часам Казак накапаў ужо ладныя кучы жвіру з абодвух бакоў і сам паглыбіўся ў яміну амаль да каленяў. Здаецца, ён няблага ўгрэўся, аж спатнеў пад нізка насунутай на лоб аблавушкай. І як чарговы раз выпрастаўся, каб шапку спіхнуць на патыліцу, у яму скочыў Валодзька.

— Дай я...

Без вялікай ахвоты Казак аддаў хлопцу кароткі тронак рыдлёўкі, якую Валодзька з імпэтам увагнаў у жвір.

Як Казак толькі пачынаў капаць, Валодзька быў побач, і яго біла дрыжака, нейкая нутраная ліхаманка, хоць ён і не адчуваў сцюжы. Увогуле ў той дзень не было халодна. Мусіць, каб як саўладаць з сабой, ён прагнуў хоць якога дзеяння, імкнучыся чымсьці заняць сябе. Тыя дні, як і ўсе, ён быў галодны, ушчэнт змораны, мінулае ночы заснуў усяго на гадзіну — сядзеў у дазоры. Але цяпер немаведама адкуль у яго ўзяліся сілы, ён капаў, бы машына — хутка й напорыста, кідаў і кідаў у бакі зямлю, не падымаючы галавы і стараючыся ні пра што не думаць.

Думкі, аднак, самі лезлі ў галаву, і самыя неадчэпныя з іх былі пра сябе. Не хацелася паміраць Валодзьку Сулашчыку, хацелася жыць. Ды, мусіць, не выпадала. Як не выпадала жыццё ягонаму бацьку, шмат каму з шарагоўцаў ды камандзіраў іхнай Слуцкай брыгады. Некаторыя, можа, і ўберагуцца, думаў Валодзька, асабліва па той бок польскай мяжы, але не ўсе. Валодзька ўжо чуў, што камандзіраў ды кіраўнікоў паўстання палякі выдалі бальшавікам, некаторых парасстралялі ў Слуцку, іншых сем'ямі вывезлі немаведама куды на ўсход. Пэўна, вывезлі й ягоную старэйшую сястру Сашу з дзяўчынкай — ведама, за такога бацьку, брата ды падпаручніка-мужа, што адышоў за Лань, па галоўцы бальшавікі не пагладзяць. Было дужа трывожна і клопатна і за сябе, і за іншых — родных і блізкіх, якім ён нічым памагчы не мог. Хіба апроч сваё смерці.

У гэтай невялічкай прымоўклай групе вайскоўцаў нутраная ліхаманка біла не аднаго Валодзьку Сулашчыка, бадай, усе яны ледзьве стрымлівалі нервовую дрыжаку. Але, можа, самы нецярплівы з іх быў Аўстрыяка. Здаля абышоўшы яму, ён толькі аднойчы зіркнуў на Валодзьку і падумаў, што капаюць яны надта марудна. Так можна і не паспець, і дачакацца горшага. Але ў яго ўжо не ставала сілы трываць. Ён угаворваў сябе: хутка ўжо скончыцца, усё супакоіцца назаўсёды. Але спакою ад таго не прыбаўлялася, рабілася ўсё нясцерпней. Хоць у думках ён і казаў сабе: ну, чаго шкадаваць? Жыцця? Дык якое гэта жыццё? Гэта пекла, боскае пакаранне, а не жыццё. Дома, у недалёкай адсюль вёсцы наўрад ці чакае яго нялюбая, чужая жонка з чатырма чужымі дзецьмі, маючы зямлю, яна прыдбае і новага мужа. Родны брат застанецца адзіным гаспадаром на бедным надзеле, і ніхто яму болей не будзе паграджаць дзяльбой. Хіба паплача крыху і супакоіцца ў звыклых клопатах пра дзяцей ды гаспадарку якія й далі яму гэтае прозвішча — Аўстрыяка. Спярша браты хацелі падзяліць гаспадарку і зямлю, але што б у іх атрымалася з тых чатырох дзесяцін бацькоўскай зямлі? Мусіць, нічога здатнага, і Аўстрыяка адступіўся. Дужа яму не хацелася, але мусіў прыстаць прымаком да аўдавелай Аўдохі, што жыла пры бальшаку на водшыбе ад вёскі. Зямлі яна мела трохі болей, чым ягоны брат, мужык не прыйшоў з вайны — памёр недзе ў Сібіры ад тыфусу. У хаце па земляной падлозе ў яе бегала чацвёра малых дзяцей, а галоўнае — дужа непрывабная была тая Аўдоха, не ляжала да яе салдацкае сэрца Аўстрыякі. Ды мусіў. Ажаніўся і стаў прывыкаць да іншага, не халасцяцкага жыцця. Пасеяў азіміну, упершыню адчуўшы сябе гаспадаром, прывёў да ладу гумно і назапасіў дрэва на дошкі для падлогі. Увосень малацілі, для ўпраўкі наняўшы памагатага з вёскі. Ураджай выдаўся неблагі, зернем засыпалі ўсе карабы ў Аўдоцінай варыўні. І тады неяк раннім восеньскім адвячоркам у хату завіталі трое. Ён не здзівіўся: сядзіба была пры дарозе, на падворак часцяком забягалі людзі — то напіцца вады, то пагрэцца, перакурыць. Але гэтыя завіталі не перакурыць, — нядоўга патупаўшы па хаце, уручылі яму абавязацельства на прадразвёрстку, сказалі, каб праз пяць дзён здаў дваццаць пудоў збожжа на патрэбу Чырвонай Арміі. Ён злосна пасварыўся з імі, сказаў: скулля вам, во ў мяне дзеці, іх карміць трэба, а Чырвоная Армія хай пасее і сажне, а не рабуе сялян. Тады, можа, праз тыдзень, якраз у нядзелю, як яны з Аўдоццяй сабраліся на кірмаш купляць парасят, з бальшака на сядзібу насыпаўся атрад чырвонаармейцаў. За дзесяць хвілін яны выграблі з варыўні ўсю збажыну, чамусьці далі яму распісацца і паехалі ў горад. А

Як зрабілі мітынг у Семежаве, ён прыбег дадому, дастаў з падстрэшша ў гумне польскі карабін і запісаўся ў паўстанцкі полк. Што-што, а ваяваць ён яшчэ не адвучыўся і думаў, што толькі так цяпер і можна чагось дамагчыся

ягоная сястрыца. Усе як-небудзь пражывуць і без яго, — як жылі без яго дагэтуль. Калі ён не пашкодзіць. А можа, і надта пашкодзіць, калі бальшавікі дазнаюцца, як ён ліха біў іх пад Мазыром. Удалыя справы былі там у войску Булак-Балаховіча, хвацкі камандзір, не тое, што гэтыя... Гэтыя болей наконт палітыкі, усё пра Беларусь... Тое няможна, гэта не дазваляецца. А генерал даваў волю і паваяваць, і пагуляць. Калі як выпадала. Праўда, Аўстрыяку выпала не шмат — хіба ён да таго імкнуўся? Ён імкнуўся да міру, хацеў зямлі, ды не збылося. Як прыйшоў з вайны на свой бядняцкі надзел, усё ў яго пайшло прахам. На тым бацькоўскім надзеле не дужа дбайна гаспадарыў старэйшы брат Казімір з трыма сынамі, ён, не распрэгшы каня, сеў на прызбу ды і прасядзеў да пайдня. Было чаго столькі пакутаваць на вайне ды ў палоне, ісці ў гэтыя прымакі, ірваць кішкі на запушчанай гаспадарцы, каб апынуцца на зіму жабраком. І што гэта за ўлада настала, як з ёю жыць? Ён так імкнуўся дадому, на сваю Беларусь, а тут аказалася горш, чым на вайне, у палоне, там хоць быў вораг, там прымушалі рабіць, нават каралі смерцю. Але там кармілі. А чым тут ён накорміць гэтых дзяцей?

Як зрабілі мітынг у Семежаве, ён прыбег дадому, дастаў з падстрэшша ў гумне польскі карабін і запісаўся ў паўстанцкі полк. Што-што, а ваяваць ён яшчэ не адвучыўся і думаў, што толькі так цяпер і можна чагось дамагчыся.

У паныльным задуменні Аўстрыяка далекавата адышоўся ад астатніх, пасля таропка вярнуўся, але яма ўсё была не гатовая. Угнуўшы шырокую спіну, там размашыста шпурляў рыдлёўкай Мяцельскі; стоячы збоч, цярпліва чакаў камандзір.

— Ну, ці хутка вы? — са скрухай вырвалася ў Аўстрыякі.

— Паспееш, — нядобразычліва буркнуў з ямы Мяцельскі.

Аўстрыяка паныла адышоў — паспееш! Ім трэба як найглыбей. Быццам тое было важна для яго — як глыбока ён будзе ляжаць у зямлі ці нават застанецца дзе незакапаны ў кустах. Мёртваму, мусіць, адзін чорт. Але гэты доўгі клопат з магілай выцягваў у Аўстрыякі ўсе жылы, ён ужо ледзьве трываў. Добра яшчэ, калі не наладзяць багамолле, — думаў ён. — Дзед ці Кажухар часам не супраць былі памаліцца. А камандзір можа яшчэ й завесці прамову-казань пра бацькаўшчыну, што таксама ня мёд. Не любіў Аўстрыяка марудзіць ні ў якой справе, не той меў характар. А зрэшты, якога д'ябла яму зараз марудзіць? Каго цяпер яму трэба слухаць? Ужо цяпер ён сам сабе гаспадар, тым больш, што ў карабіне ў яго засталіся тры патроны. Яму ж хопіць і аднаго.

Падумаўшы так, ён адкінуў крысце свайго шызага, з двума радамі гузікаў аўстрыйскага шыняля, сеў на шорсткі белы імшанік і сцягнуў з адной нагі бот. Брудная сапрэлая ануча сама раскруцілася на ступні, ён даслаў патрон у патроннік і вялікім пальцам нагі намацаў спускавую скабу. Каб не разбурыць раптоўны намер, нават не зірнуў у той бок, дзе былі астатнія, рашуча ціснануў на спуск.

Ягоны знянацкавы стрэл змусіў усіх скалануцца. Крутнуўшыся ад ямы, мусіць, адразу зразумеў усё камандзір.

— Не дачакаўся! — сказаў ён, і відавочны боль мільгануў на ягоным схуднелым твары. — Забела і ты, — кіўнуў ён Казаку. — Давайце яго сюды.

Не дужа, аднак, рашуча двое шарагоўцаў падышлі да нерухомага, скорчанага на баку Аўстрыякі, з разбітай пашчэнкі якога лілася кроў — на цёмны, зашмальцаваны каўнер шыняля, на плячо, густа капала ў мох. Неяк няўмела яны падхапілі Аўстрыяку за рукі, пацягнулі нагамі па доле да ямы. Казак перад тым хацеў узяць карабін, ды Забела нецярпліва гыркнуў: «начорта табе», і той кінуў зброю на дол.

Яма ўсё яшчэ не была гатовая, мусіць, сапраўды трэба было яе паглыбіць на аршын ці болей. Пасля нядоўгага перапынку, выкліканага Аўстрыякавым стрэлам, Мяцельскі зноў налёг на рыдлёўку. Яму таксама трываць было трудна, не ставала сілы чакаць, карцела скончыць усё як найхутчэй. Тое, што Аўстрыяка апярэдзіў усіх, яму не спадабалася — які разумны! Не стрываў. Добра яшчэ, калі ягоны стрэл не пачулі тыя, што недзе засталіся ззаду. А калі ўчулі? Вельмі нават проста яны тут могуць не справіцца са сваёй задумай ды трапяць у іншую пастку. Яшчэ страшнейшую.

Але Мяцельскі ўжо ведаў, што жывым яму трапляць у бальшавіцкія лапы нельга, аднойчы ён ужо быў у тых лапах. І хоць тады левыя эсэры былі ў хаўрусе з бальшавікамі, да яго прычапіліся, быццам ён абурыўся на мітынгу за тое, што бальшавікі разагналі Усебеларускі кангрэс, на які выбіралі дэлегатаў усе — і армія, і сяляне, і работнікі. Вылучалі, абмяркоўвалі, галасавалі. Мяцельскі быў такі рады, што ад іхняе роты прайшоў ягоны сябра прапаршчык Каўшовіч, за якога Мяцельскі месяц драў горла на мітынгах. Ледзьве не ўсім палком яны праводзілі прапаршчыка на станцыю ў Маладэчне, паціскалі руку, давалі наказы. Пасля сталі чакаць. Але неўзабаве, замест дэлегата-прапаршчыка, прыйшла вестка, што кангрэс разагнаны бальшавікамі, а Каўшовіч толькі праз тыдзень ледзьве дабраўся з Менску — без шашкі, дакументаў і без мандата. Усё адабралі бальшавікі. Такога старэйшы унтэр-афіцэр Мяцельскі стрываць не мог і з двума сябрукамі далучыўся да партыі эсэраў. Зноў разам з Каўшовічам яны ледзьве не штодня выступалі на салдацкіх мітынгах. Прапаршчык дык стараўся гаварыць складна, па-інтэлігенцку, а Мяцельскі звыклым салдацкім мацюгом «мяцеліў» і сваіх палкавых бальшавікоў, і іхнага начальніка Мяснікова, якога называў не йначай як крывавым мясніком. Зімой яго ўзяла чразвычайка, пасадзіла ў смярдзючае складское сутарэнне, дзе напачатку ён добра выспаўся і думаў, што, мабыць, хутка выпусцяць. Але не выпусцілі, а дні праз тры павялі наверх, да нейкага мізэрнага чарнявага камісарчыка. Той хвілін пяць вывучаў нейкія паперы, дзе, мабыць, было напісана пра іншыя выразы наконт «крывавага мясніка», а пасля запытаўся, ці казаў ён тое. На гэта Мяцельскі з невінаватым выглядам перапытаў: «А што — няпраўда?». Ён бы мог лёгка даказаць праўдзівасць уласных словаў, але замест таго, каб слухаць арыштанта, камісарчык ускочыў з-за стала і замахнуўся ботам, цаляючы яму паміж ног. Мяцельскі лёгка перахапіў той бот, трошкі тузануў, і камісарчык бразнуўся патыліцай на падлогу. Ён толькі ўсміхнуўся з слабасільнага небаракі, ды рана, відаць, усміхнуўся. У пакой уваралася іх цэлая зграя, яны «мяцелілі» яго ў куце, пасля на падлозе, у яго не засталося жывога месца на целе, і ён тры дні не падымаўся з гнілой саломы ў сваім сутарэнні. А як паднялі на чарговы допыт, у тым пакоі ўжо сядзеў іншы — мажны, таўставаты чалавек у вайсковай гімнасцёрцы, ён усмешыста, быццам нават спачувальна сустрэў арыштанта, папытаўся прозвішча і, макнуўшы ў чарнільніцу ручку, выразным почыркам вывеў на паперыне «расстраляць». Чамусьці яго не расстралялі адразу, некалькі дзён ён пакутаваў у сутарэнні, а затым у Менск увайшлі немцы.

Варта з тае чразвычайкі паўцякала, дзверы расчыніліся, і Мяцельскі, трымаючыся за сцены, выйшаў на вуліцу. «Не! — сказаў ён сабе. — З гэтымі людзьмі не жыць. Не дадуць». Паўгода затым ён сядзеў нахлебнікам у гараджанкі-сястры, крыху рабіў на бровары, быў за вучня ў габрая-шаўца, пілаваў з татарынам дровы для менчукоў. Як выбухнула гэтае паўстанне за незалежнасць, падаўся ў Слуцак, затым у Семежава, уступіў у Грозаўскі полк. Шкада, ім не пашэнціла ў снежні, не пашэнціла асобнаму батальёну ў партызанстве пасля паўстання. Сілы былі не тыя, і бальшавікі іх разграмілі адзін раз, затым другі і трэці. Увесну вайсковае шчасце канчаткова здрадзіла паўстанцам, пазбавіла іх магчымасці жыць.



Кажухар з Дзедам тым часам сядзелі наводдаль і ціха гутарылі. Зрэшты, болей мовіў пра сваё Кажухар, якому, не перастаючы, балела рука. Пасля ранення перавязаць яе не было чым, тады абкруцілі па локаць нейкай зрэбнай анучай, якая адразу набрыняла крывёй, затым зверху скарэла, і Кажухар болей не адважыўся яе садраць. Ды і навошта ўжо здзіраць, хутка павінна было ўсё скончыцца — і боль, і ўсё астатняе. Люляючы цяпер гэтае балючае за пазухай валлё, паранены мерна пагойдваўся ад болю і праз слёзы ціха жаліўся Дзеду:

— Ну завошта такая доля, скажы? Хіба я... Праціў Бога, ці што? Ці супраць людзей? Каб хоць як-небудзь жыць, дык нельга.

— Гэ, чаго захацеў! — зласнавата перапыніў яго Дзед. — Жыць!

— Ну. Жыць і то нельга.

— Было. Аджылі. А цяпер ляжам.

— Ляжам? Божа мой, Божа...

Кажухар, аднак, не дужа бедаваў, што ляжа, спакутаваны ад болю, ён прагнуў аднаго — скончыць свае пакуты. Хаця б і ў магіле. Усё роўна жыццё спляжанае дарэшты. Некалі марыў набыць зямлю, каб зажыць на сваёй гаспадарцы, і нібы вол, ад зары да зары шыў кажухі, збіраў грошы. Абшыў кажухамі, лічы, такі горад, як Слуцак, а ягоная праца абярнулася торбай керанак, на паўпуда солі. Добра, што сын Уладзя, не глядзі што малады, а ўдаўся разумнейшым за бацьку, не падманіўся на ягонае рамяство, пайшоў у горад служыць. Можа, чаго й даслужыцца, асабліва калі выб'ецца ў якое начальства ды паладзіць з бальшавікамі. Бацька во не паладзіў, за тое яму такая расплата.

Ад болю ды роспачы Кажухар і стагнаў, і круціўся ў доле. Вочы яго змакрэлі, і ён ужо не саромеўся тае макраты, не выціраў іх. А Дзед побач бы й не прыкмячаў таго, сядзеў, унурыўшыся нерухомым позіркам у дол, і моўчкі, пакутна перажываў нядаўняе мінулае, яшчэ да паўстання, калі ён быў дома і пасварыўся з жонкай. Брыдка пасварыўся, хоць і было за што. Жонка ў каторы раз зрабіла не так, але ж... Гэтая жаласлівая кабета заўжды кагось шкадавала — то дзяцей, то суседак, ды асабліва каго-небудзь з радні. Хто бяднейшы. А бяднейшым з усіх быў яе малодшы брат Сёмка, мнагадзетны і негаспадарлівы селянін, які звычайна з Вялікадня сядзеў без кавалка хлеба. У Дзеда ў свіронку была прыхаваная тарбінка грэчкі, меўся па вясне засеяць лапік ля сажалкі — не ўсё ж душыцца бульбай ды крупнікам. Але во жонка, як яго не было дома, добра-такі адсыпала з тае тарбіны брату — бач, згаладнелі дзеці. Згаладнеюць, ведама, бо трэба працаваць, дбаць пра дзяцей ды гаспадарку, а не лайдачыць паўгода на печы. І вось аддала пуд грэчкі, быццам самой непатрэбна. Дзеда гэта абурыла, проста ўзарвала, і ён даў добрага штурхаля жонцы, тая ўпала, загаласіла, а ён выскачыў на падворак, у самога аж трэсліся рукі. Якраз трэба было збірацца ў полк на фармоўку, ён забег дадому за сякім-такім харчам, ды так і пайшоў улегцы, пад жончын плач. Спакваля, аднак, падабрэў, мінулася злосць, і не шкада стала той грэчкі, а паскуднае пачуццё засталося, не міналася, нават расло з часам, і цяпер выбухнула, заглушыўшы ўсё іншае — ну трэба было? Гары яна гарам і грэчка, і ягоная ашчаднасць. Ён гатовы быў аддаць усё, абы толькі засталася згода, дабрыня ды шкадаванне адно аднаго. Бо чым цяпер жонка будзе памятаць яго? Тым грубым, злым штурхалём, ад якога паляцела ў кут?

Кепска, горка і балюча было на душы ў Дзеда. Калі б не іх гэты канец, можа б, яшчэ і павініўся, і паладзіў з жонкай. Увогуле, яна была не злапомная, даравала рознае, не першы раз. Але ўжо не павінішся — усё панясеш з сабой. На той свет. І ўсё праз гэтае іх жыццё, спрадвечную сялянскую галоту, якая душыла вяскоўцаў, не давала па-людску жыць і нават па-людску памерці.

— Божа міласэрны, маці-царыца нябесная, — са слязьмі шаптаў побач Кажухар. — Не пакінь нас, не адвярніся хоць у гэты астатні час...

— Успомніў! — зноў зласнавата буркнуў Дзед. — Як прыпячэ, тады ўспамінаем. Раней помніць трэба было.

— Ды ці я калі забываўся? Я заўжды помню, маліўся...

— А цяпер маліся, не маліся — адзін канец.

— Ай, Божачка ты мой, Божачка! — ледзьве не екатаў Кажухар, усё люляючы руку. Так было яму балюча — і ад рукі, і на сэрцы, і хацелася спагады хоць бы ад таго, хто апынуўся тады бліжэй за іншых. Ды чалавек той, відаць, не прывык спачуваць. Зноў жа марна было цяпер спачуваць каму-небудзь — усе яны апынуліся ў аднолькавым гаротным стане і мелі аднолькавыя падставы для спачування. Ад каго толькі? Хіба ад госпада Бога.

Мяцельскі капаў апантана, але, мусіць, трэба было глыбей, хоць няроўныя, абрушаныя берагі дасягалі яму пад пахі. Ды ён пачаў стамляцца, і камандзір, які прыкмячаў усё, кінуў Забелу:

— Давай, падмяні.

Нядаўні гімназіст Ігар Забела з яўнаю неахвотай улез у яму, пераняў з рук Мяцельскага цёплы ад натруджаных далоняў тронак рыдлёўкі. Неяк так сталася, што ён хутка перажыў сваё напружанне; стрэл, а затым і скрываўленая галава Аўстрыякі вярнулі яго да самотнай рэальнасці, якая абяцала неўзабаве паставіць вялікую кропку на ўсім. Усвядоміўшы тое, Ігар адчуў рэзкі інстынктыўны пратэст — як было добраахвотна класціся ў зямлю ў свае няпоўныя дзевятнаццаць гадоў? Але няўмольная сіла абставін, якая ўсе апошнія гады люта ўладарыла над людскімі лёсамі, гнула ягоную волю ў дугу, заўсёды дамагаючыся свайго. Рэдка калі тыя абставіны выяўлялі паслабку, давалі зрабіць, як сам хочаш. Дзіўна, але тады, у той самы рашучы вечар, калі ён мог бы зрабіць інакш, ён інакш не зрабіў. Праз боязь, страх і трывогу ён зрабіў так, як вымагаў ад яго сяброўскі абавязак, па-свойму зразуметае высакародства. Ён не адмовіў Алегу Блажэвічу, ён пайшоў з ім. Ранічкай, як маці яшчэ спала, таропка сабраў свой небагаты набытак — пару бялізны, башлык, пачак папярос, Лёльчына фота і шаснуў праз чорны ход на зборны пункт у гімназію. Сярод пракуранай людской гаманы не адразу знайшоў свойго старэйшага сябра Блажэвіча, які, паціскаючы яму руку, каротка кінуў: «Малайчына, умееш трымаць слова гонару» — і запісаў у сваё аддзяленне. Тады, можа, першы і адзіны раз Ігар ціха паганарыўся ў душы за сваё высакародства, што намогся і стрымаў слова. Што, калі спатрэбілася, можа, на справе абараніць незалежнасць народнай рэспублікі, пра якую сказана столькі прыгожых і рашучых словаў. Ці ён думаў тады, што праз колькі тыдняў будзе выцягваць скрываўленае цела Блажэвіча з заснежанага поля пад Семежавам — цяжкапаранены ўранку, той да вечара сцякаў крывёй пад бальшавіцкім агнём, увесь дзень да яго нельга было падабрацца. Ігару ў тых баях наогул пашчасціла, можа, пашчасціла і пазней, ніводная бальшавіцкая куля яго не зачапіла. Мусіць бы, куды лепш было яму легчы разам з Блажэвічам, прынамсі, не спазнаў бы таго, што давялося спазнаць затым і што не дай Бог спазнаць нікому. І не толькі іх жахлівы паўстанцкі лёс, але і трохі іншае. Яшчэ да таго, як спаліць усе дакументы, неяк лежачы надвячоркам у кустоўі, ён спаліў Лёльчына фота, як дазнаўся ад людзей, што яго светлае, незямное каханне стала жонкаю чырвонага слуцкага ваенкома. Ён узненавідзеў яе за здраду, без агіды не мог сабе ўявіць, як яна цалуецца там са смярдзючым бальшавіцкім камісарам, не разумеў, чаму яна стала не такой, як была раней, — чужой, нават варожай. Але неяк памалу тая яго нелюбоў выпетрылася, Лёлька рабілася для яго ўсё больш абыякавай, і ён болей думаў пра маму, дужа дакараў сябе за ўсё тое, што прычыніў ёй сваім гэтым свавольствам. А найбольш ён шкадаваў сябе, сваё кароткае жыццё. Жыццё, канечне, не ўдалося, чаго было за яго трымацца, чаго шкадаваць? Але ўсё роўна было шкада, хацелася жыць хоць як-небудзь, хай у той іх калатнечы. Ды было неяк. Неяк, бо ён дужа любіў сваю маму, што ўжо страціла на мінулай вайне ягонага айчыма, штабс-капітана Левандоўскага, любіў-шкадаваў меншага брацікa Паўліка. Як ім будзе жыць пры такім іх сынку і братку?

Забела капаў не так каб і ўвішна. Глыбіня стала, мусіць, такой, якой і патрэбна было, кідаць жвір ён намагаўся высока, ды глыжы ўсё скочваліся з берагоў у яму — ужо не ставала сілы кідаць вышэй і далей. Зноў жа падмяніць яго, мусіць, не засталося нікога, пэўна, усе ўжо адбылі сваю чаргу. Апроч, вядома, параненых Кажухара і камандзіра. Значыць, яму і давяршаць гэтую невясёлую справу.

Камандзір не мог скрануць шыяй, павярнуць галавы, але ён дбаў усё рабіць як належыць і кожную справу даводзіць да канца. Гэта было ягоным правілам са студэнцкай маладосці, як вучыўся ў семінарыі, затым выкладаў у гімназіі, а таксама ў вайну, калі, стаўшы прапаршчыкам, камандаваў паўротай у інгерманляндскім палку. І калі ў яго штосьці не атрымлівалася, не знаходзіла завяршэння, дык часцей не з ягонай віны — з прычыны ўмяшання вышэйшых камандзіраў ці збегу зменлівых абставін. Як з гэтым іх партызанствам. Калі б ён быў на месцы камандзіра батальёна, дык шмат што, асабліва спачатку, рабіў бы інакш, не лез бы на злом галавы супраць пэўнай сілы, і, можа б, тады яны не дайшлі да гэтае ямы як да нейкай містычнай расплаты за ўсё ранейшае. Ці да апошняй кропкі ў тупіку, куды іх загнаў неміласэрны паўстанцкі лёс.

Цярпліва чакаючы, калі нарэшце будзе гатовая гэтая яма-магіла, камандзір міжволі і ў каторы раз перабіраў у памяці падзеі апошніх тыдняў-месяцаў іх барацьбы, каб усё ж хоць перад канцом зразумець нейкі таямнічы сэнс іхнага трагічнага фіналу. Але, мусіць, усё ўжо было перабрана ў памяці. Натуральна, камандзір разумеў, што прысуд ім быў вынесены даўно, гэты зыход быў відавочны, як толькі яны кінулі выклік страшнай сіле і сталі са зброяй у шарэнгу. Выклік быў дзёрзкі і рашучы, а сілы ўсё ж малыя, і менавіта гэтая акалічнасць вырашыла ўсё астатняе. Але і як было іначай? Народ чакаў, а кіраўнікі адзін перад адным імкнуліся выступіць. Верныя рыцары рашучай фразы, яны спярша ап'янілі тых, хто іх слухаў на ўсіх тых шматлюдных мітынгах, а затым неўпрыцям і самі паверылі ў свае прыгожыя словы. Калі ж і самі сталі нявольнікамі ўласных хмельных прамоваў, тады ўжо нічога нельга было ні спыніць, ні перайначыць. Яны былі змушаныя, за імі пайшлі іншыя, — найперш, хто мала разумеў, але надта верыў. А то ішлі з пачуцця абавязку, раптоўна народжанага гонару — і таму не маглі не пайсці. Калі не цяпер, дык калі ж? Хіба што ніколі. Але ніколі — было страшна, страшней за пагібель, бо было банкруцтвам усяе святой, шматгадовае справы. Так, ён таксама нямала сумняваўся ў хуткім поспеху паўстання, яшчэ больш было ў яго недаверу да колькі-небудзь удалага партызанства іхнага асобнага батальёна. Але ішоў, бо для яго заставалася пэўным: тое трэба было колісь зрабіць, раней ці пазней. Без таго, бяз іхнае галаваломнае адвагі, ахвяр і крыві ўся іх нацыянальная справа, бы невылечны сухотнік, асуджаная на вялы, задоўжаны скон. Цяпер на скон не будзе асуджана. Зерне кінута, па вясне ўгрэецца глеба, будуць усходы. Колькі б зіма ні доўжылася, настане вясна. Яны ж угнояць глебу, мусіць, такое іх гістарычнае прызначэнне, так трэба. Для вольнай радзімы і для гісторыі.

Так суцяшаў сябе камандзір, а гаркота няўдачы душыла яго, сціскала прастрэленую шыю, цяжка было дыхаць — на хадзе і тут, па-над ямай таксама. І тады ён успомніў даўні, звыклы з юнацтва твар другога асуджанага, што калісьці стаяў не над ямай — пад вісельняй, і яго вешчыя словы да каханай Марыські. Да Беларусі. Ніколі яна не будзе ні вольнаю, ні шчасліваю, пакуль не скіне з душы прыгон маскаля. Апынуцца паміж Расеяй і Польшчай — усё роўна што паміж кувалдай

Заканчэнне на стар. 14 (8) »

На чорных лядах

« Заканчэнне. Пачатак на стар. 11-13 (5-7)

і молатам, які б’е метадычна, магутна, бязлітасна. Нішто не стрывае тых жахлівых udараў. Пакуль б’е молат і рэжа галовы серп. Гэта ж трэба такое прыдумаць — молат і серп, серп і молат…

Сарокі ў голлі сакаталі ўсё болей, бы прадчуваючы тое страшнае, што тут неўзабаве адбудзецца. Іх ужо ніхто не адганяў, не палохаў, і яны бязладна паначапляліся на бярозах, спраўлялі свае птушыныя хаўтуры. Зводдаль ад іх з’явіліся з тры вароны. Тыя сядзелі спакайней, толькі здзіўлена пазіралі ўніз, але маўчалі. Людзям жа было не да іх. Людзі апекаваліся ўласным клопатам.

Можа, самы спакойны, ціхмяны і з выгляду нават абыякавы да ўсяго ў гэтай грамадцы быў Казак, шараговы стралец, патомны парабак слуцкіх фальваркаў. Галоўным правілам яго ў жыцці было: як усе. Як усе паводзіў сябе ён, калі рабіў у пана Пясецкага: рабіць дык рабіць, есці дык есці, спаць дык спаць — як усе. І на паўстанне пайшоў таму, што пайшлі парабкоўцы з маёнтка — усе шасцёра. Калі б яны пайшлі да бальшавікоў, мусіць, да бальшавікоў пайшоў бы і Казак. Але вызначыў выпадак ці, можа, адзін парабак, які па вясне паявіўся ў іхным маёнтку. Ён не казаў, дзе рабіў да таго, але ў маёнтку быў прыстаўлены памагатым да цесляра, рамантаваў інвентар. Гэта быў дужа гаваркі чалавек. Спярша хлопцы не дужа верылі, казалі: балбоча. Але неўзабаве ўслухаліся і сцямілі, што балбоча не так сабе, нешта ўсё ж ведае. А і сапраўды, ведаў ён шмат што і шмат дзе пабываў за свае яшчэ маладыя гады, нават у Піцеры і ў Рызе. Казаў, што па перакананнях ён сацыяліст-эсэр і што толькі тады па-людску зажывуць працоўныя людзі, як падзеляць панскую зямлю. Але перш чым падзяліць, зямлю трэба было адваяваць у паноў — палякаў ды расейцаў, Беларусь павінна стаць незалежнай, як Польшча ці Нямеччына, мець свой урад і свой парламент. Спярша гэта здалося дзіўнаватым — беларускі парламент! Але пасля, як у Менску сабралі кангрэс, хлопцы і праўда паверылі эсэру, бо нешта там адбывалася падобнае на яго прадказанні. Як загарэлася гэтая калатнеча ў Слуцку, ён і сагітаваў усіх ехаць туды. Казак доўга не вагаўся, прыкінуў: ваяваць за Беларусь мо не будзе трудней, чым штодня ішачыць у панскім маёнтку. Зноў жа, адгаворваць яго не было каму, шкадаваць таксама. Уранку яны запрэглі панскую фуру і ўсе шасцёра пакацілі шашою ў Слуцак. Начальнікі і каторыя разумнейшыя з шарагоўцаў казалі: да зімы пераможам, вернемся і зажывём сваёй беларускай сям’ёй, па справядлівасці, без маскалёў і палякаў. Ведама ж, жыць сваёю сям’ёй, па справядлівасці ды ў згодзе – хто не схацеў бы? Асабліва яшчэ, калі надзеляць зямлёй. Казак быў не супраць.



Абы ўдалося. На жаль, не ўдалося. Не толькі сваёй сямейкай, але й наогул жыць. Ды што ж… Казак не разумнейшы за іншых і, канечне, не шчаслівейшы. Калі во камандзір, былы афіцэр і вучыцель, кажа, што іначай нельга, значыцца, і праўда нельга. Значыць, нявыкрутка, і таго, што яны ўдумалі, мусіць, не абысці. Прыйдзецца паміраць. Але як усе, так і Казак. Вось калі б закурыць толькі. Перад смерцю…

Закурыць, аднак, не было ні ў кога, і Казак патупаў, патупаў каля кучы жвіру ды стаў чакаць свайго часу.

Нарэшце адчуўшы, што хопіць, Забела збольшага параўняў дол у яме, памераў крокамі. Атрымалася восем крокаў удоўжкі, мабыць, хопіць на ўсіх.

— Фініта ля камедыя! — знарок бадзёрым голасам гукнуў ён і кінуў угору рыдлёўку.

— Ладна, годзе, — глуха азваўся камандзір і паклікаў астатніх. — Усе — сюды!

Уранку яны запрэглі панскую фуру і шасцёра пакацілі шашою ў Слуцак. Начальнікі і каторыя разумнейшыя з шарагоўцаў казалі: да зімы пераможам, вернемся і зажывём сваёй беларускай сям’ёй, па справядлівасці, без маскалёў і палякаў.

Калі яны неяк нясмела, бы баючыся, узлязалі на жвір, бліжай да ямы, камандзір ціха спытаўся:

— Хто першы?

— Першы ўжо ёсць, — сказаў Мяцельскі. — Во Аўстрыяка.

— Давай яго сюды.

Разварочваючы ботамі рыхлую кучу, Мяцельскі рашуча падвалок распластанае цела Аўстрыякі да ямы, уніз галавой падаў яго Забелу. Той, ледзьве сам утрымаўшыся на нагах, пераняў небараку, сцягнуў з краю ямы і неяк выпрастаў яго ў доле. Рукі Аўстрыякі трэба было пакласці на грудзях, але тыя ніяк не хацелі складвацца і тырчэлі скорчанымі пальцамі ўгору.

Тым часам да ямы падышлі Дзед з Кажухаром; трошкі зводдаль боязна-ваўкавата прыткнуўся непрыкметны Казак. Валодзька ўвесь час быў побач з камандзірам. Ён змарнеў з твару, прыціх, здаецца, баяўся вымавіць слова. Мяцельскі высока стаяў на кучы жвіру.

— Дык як будзем? Па адным ці ўсе разам?

— Па адным, — ціха мовіў камандзір. — З нагана.

— У яме. Каб меней грукату.

Мабыць, усе ўсё зразумелі і сціхлі, нават не дыхалі. Камандзір абвёў усіх чужым напружаным позіркам і адчуў, што трэба нешта сказаць на развітанне. Ці на суцяшэнне. І ён сказаў:

— Што ж, спадары… Нам не ўдалося, можа, удасца іншым. Яны нас успомняць. Усё ж мы не за сябе, не за сваё, якога ў нас не было. Мы — за Беларусь. Нашу няшчасную старонку. Прымі, Божа, твае ахвяры…

Яны ўсе стаялі і маўчалі. Яны чакалі. І камандзір, зглытнуўшы даўкі камяк у набалелым горле, раптам сказаў са знарочыстай строгасцю:

— Хто першы?

Выдалася кароценькая пакутная паўза, пасля якой Мяцельскі кінуў са злосным адчаем:

— Ат, маць тваю… Давай я…

Зноў абрушваючы жвір, рашуча скочыў у яму.

— Давайце рэвальвер!

Камандзір расшпіліў на баку кабуру, выняў наган. Мяцельскі ўхапіў яго знізу, рухава выцягся побач з застылым ужо Аўстрыякам.

— Жыве Беларусь!

— Жыве, — нечакана слабым голасам азваўся камандзір, і глухі рэвальверны стрэл у яме перапыніў ягоны водгук. Дзве сарокі з бліжняй бярозы спуджана пераляцелі на дрэвы далей. А на зямлі зноў настала пакутная паўза, усе стаялі моўчкі, баючыся зазірнуць у яму.

— Ну, хто далей? Ты, Зубко? — няпэўна павярнуўся камандзір да Дзеда. Той сігануў цераз жвір і спыніўся.

— А ружжо?

— З ружжом, братка, — мякка сказаў камандзір.

Тады Дзед неяк грузна зваліўся ў яму, і яны зноў зьнерухомелі, чакаючы. Чакаць, аднак, давялося нядоўга, стрэл коратка гукнуў і сціх.

— Ну? — зноў павярнуўся камандзір да астатніх. Засталося іх тут пяцёра. — Ты? — запытальна кіўнуў ён да Кажухара.

— Ды я… Калі адважуся. Калі што, дык прыстралі, камандзір. Калі што…

І няспрытна ўсеўшы на бераг ямы, Кажухар ціха споўз туды. Яны зноў прыціхлі. Чакаць давялося даўжэй, чым тыя разы, мусіць, Кажухару не дужа ўпраўна было з адною рукой. Нарэшце-такі ў яме лопнула тугім стрэлам. Камандзір падышоў, зазірнуў туды, пастаяў крыху, угледаючыся ўніз, ды зноў павярнуўся да астатніх.

— Так. Забела!

— Я! — з гатоўнасцю адгукнуўся Ігар і, не раздумваючы, лёгка скочыў уніз. — Я зараз. Тут толькі трэба паправіць, — пачулася з ямы.

Яны не глядзелі, што ён там папраўляе. Міжволі мярцвеючы ў страхавітым напружанні, яны чакалі стрэлу. У барабане нагана яшчэ заставалася тры патроны. Але ж тут іх стаяла чацвёра… Гэтае адкрыццё спярша збянтэжыла камандзіра, а затым раптам узрадавала. Здаецца, яно давала нейкае выйсце ў няпростай сітуацыі, пра якую ён цяпер напружана думаў.

Калі, як заўжды, боязна вычакаўшы стрэлу, яны азірнуліся, дык Казак адчуў, што настала яго чарга. Без напамінку або загада ён разам са стрэльбай лёгка шаснуў у яму, дзе праз кароткі час трэснуў рэвальверны стрэл. На край ямы ступіў амаль змярцвелы Валодзька.

— Сулашчык! — гукнуў да яго камандзір. — Пастой…

Валодзька спыніўся, ледзьве ўтрымаўшыся на беражку ямы. Ён нават не зірнуў туды, штосьці новае адчуўшы ў голасе камандзіра.

— Табе, Сулашчык, заданне: закапаць, зараўняць. Каб следу не асталося. І — жыві!

— Я?

— Ты, а хто ж. Жыві. За нас, за бацьку. Дай я цябе абдыму.

Няспрытна, адною рукой камандзір нямоцна абняў Валодзьку. Трохі памарудзіў і таксама, густа абрушваючы жвір з берагоў, зваліўся ў яму. Валодзька застаўся стаяць — прыгаломшаны, разгублены, працяты адным пытаннем: як гэта — жыві? Адзін? За ўсіх? Але як яму жыць без іх? Ці магчыма гэта наогул? Тое было незразумела, і ён стаяў, агаломшаны, аднак, раптоўнай надзеяй, што будзе жыць. Яна, тая надзея, заглушыла ўсе ранейшыя памкненні, разбудзіла новыя пачуцці. У душу лінула святло, і ён ажно скалануўся ад неспадзеўкі, калі з ямы пачуўся апошні стрэл. Гэта быў стрэл камандзіра. Валодзька застаўся жыць.

Пасля ён закопваў яму-магілу і плакаў. Ужо можна было не стрымліваць слёз, саромецца тут не было каго. У яму ён не зірнуў ні разу, ён гроб і гроб рыдлёўкаю рыхлы жвір з берагоў і думаў, што здатная будзе магіла, сухая, калі б такая дасталася бацьку. Крыўдна было да слёз, але бацьку ён закапаў на прырэчнай балацявіне, у тарфяніку. Выкапаць глыбока там не было як, падступала балотная вада, ды і часу надарылася якая гадзіна. Такі вось лёс чалавека, якога Валодзька любіў усё жыццё, жыць з якім усё жыццё марыў. Ды жыць не давялося. Здаецца, болей за ўсё бацька любіў Беларусь, і за гэтую сваю любоў дзевяць гадоў прагібеў на нарымскай катарзе, нажыў там сухоты. За той час бязбацькавічам падрос у Клецку Валодзька. Доўгія гады марыў, як дачакаецца і сустрэне з катаргі свайго сацыяліста-бацьку, і яны затым будуць заўсёды разам. І праўда, дачакаўся. Ды разам давялося пабыць нямнога, бацьку зноў паклікала Беларусь. Ідучы на фармаванне палка, той нізашто не схацеў браць з сабой пятнаццацігадовага сына, казаў: рана, хай чакае яго з перамогай пад бел-чырвона-белым штандарам. Валодзька і праўда застаўся дома, у іх слуцкім дамку, дзе яны другі год кватаравалі ў пані Хаванскай. Ды дома Валодзька доўга не ўседзеў, асабліва калі дазнаўся, што ягоны катаржнік-бацька стаў камандзірам роты, у якую набірае шарагоўцаў. Маці яго тры гады таму як памерла, дома гаспадарыла старэйшая Валодзькава сястра Саша, якая сама рвалася ў войска, дзе апынуўся яе падпаручнік муж, але ў яе была маленькая дачушка Леначка, і Валодзька наважыўся. Аднойчы ў марозлівы восеньскі адвячорак ён нечакана паявіўся ў Грозаве, адшукаў у штабной хаце бацьку, і ў таго ўжо не хапіла рашучасці прагнаць яго з батальёна. Над Мораччу зазімкам яны прыкрывалі з групай адыход батальёна, і бацька, перабягаючы, атрымаў тры кулі ў грудзі. Доўга, марудна канаў на руках у сцярнелага ад гора сына. Валодзька ледзьве паспеў закапаць яго ў балацявіне, калі ўжо бальшавіцкія ланцугі шарылі ў прырэчным кустоўі — шукалі параненых.

Капаў Валодзька нядоўга, з усяе сілы гроб і гроб жвір, раўняў, раскідваў яго ў бакі, каб меней было прыкметна, што тут нехта поркаўся. Стаміўся страшэнна, але спакваля пачаў спакайнець. Перад тым усё баяўся не справіцца, не паспець скончыць сваю сумную справу. Усё азіраўся, баючыся, што між хвояў паявіцца тые. Але, здаецца, паспеў. Уся зброя — наган і вінтоўкі — засталіся ў яме, у яго была толькі рыдлёўка, якую трэба было закінуць куды далей. Каб не знайшлі.

Мабыць, ужо надвячоркам з той рыдлёўкай у руцэ ён і пабрыў па лесе. За ім, пералятаючы з дрэва на дрэва, сакатала і сакатала, бы гналася, зграя сарок, і ён не ведаў, як ад іх адчапіцца.

Ён ішоў і ішоў, сам не ведаючы, куды — абы прэч з гэтых жудасных Чорных лядаў…

Рух застаўся

Алесь КАМОЦКІ

* * *

*Не надта мы ўжо думаем
пра вечнае,
Аддаўшы перавагу выпадковаму,
Пакуль здзіўляюць сэнсам
дні сустрэчныя,
Пакуль ірвуць спакой прычыны новыя.*

*Замест таго, каб кожны вечар каяцца,
Да сноў кароткі шлях шукаем
вечарам,
Бо заўтра ж трэба радавацца раніцы
І пачынаць таксама трэба з нечага.*

* * *

*То пяском, то снегам церусіць у вочы.
То зіма, то лета блытаюць шляхі.
Там пустой дарогай ты ісці не хочаш,
Тут шукаеш сцежак вузкіх і глухіх.*

*Там калісці ведаў тых, хто разумее
І, праз пэўны сподзеў, ведаў, што рабіць.
Ведаў, што патрапіш,
ведаў, што паспееш.
Тут абы не помніць, тут забыць абы.*

*Рух спыняць не варта без жывой прычыны,
Каб шукаць кірунак і агорваць час, —
Дзверы знойдзеш потым, потым іх
адчыніш —
Рух спыняць не варта, ён адзіны ў нас.*

*Рух калісьці ведаў тых, хто разумее
І, праз пэўны сподзеў, ведаў што шукаць.
Ведаў, што патрапіць, ведаў, што паспее.
Рух застаўся сілай у сляпых руках.*

* * *

*Час пачуўся, мы пайшлі
Ва усе бакі зямлі
Каб натрапіць, хто на мэту, хто на лёс.
Кожны мроіў, як умеў,
Быў у кожнага намер,
Кожны рос, але не кожны разумнеў.*

*Першы крок. Новы крок.
Уперад ён, назад, ці ў пэўны бок.
Новы крок. Першы крок.
Губляецца ў тысячах дарог.*

*Смак крутых дзіцячых мрой
І рашучы свой настрой
Раскідаць знайшлі магчымасць па жыцці.
Мутных справаў важкі сэнс
Адмяніў агонь вачэй,
Навучыў за ўсё, што маем, заплаціць.*

*Штосьці з марамі не так,
Марым мары абы як,
Неяк цяжка разабрацца — дзе чые.
Зрэшты, кожнаму сваё
Вынік розны дастаём
Нам пытанняў да адказаў не стае.*

*Новы крок. Кожны крок.
Уперад ён, назад ці ў пэўны бок.
Кожны крок. Новы крок.
Губляецца ў тысячах дарог.*

* * *

*у час расплюшчыць вочы
патрабуе ранак сёння
але ж хіба ён у нас
надоўга
новы дзень прыходзіць і пара старому
палічыць што нарабіў*

*ужо чакае вынік
складзены з пытанняў вечных
і на ўсе адказ адзін
адзіны
той які не хоча ні удзень ні ўночы
быць пачаткам забыцця*

*нам нарадзіцца быццам стала
справай звыклай толькі
як забыцца думаць пра
набыткі
зроблены з падманаў
кволае пашаны
няўпэўненых людзей*

*покуль ім патрэба
торкаць пальцам неба тупа
і тлумачыць мэту тым
ці гэтым
каб здавацца
новы сэнс забраць у слова
і упарта не чакаць*

*а мы глядзім і бачым
як натоўп тапоча міма
даганяць яго бадай
не варта
ні хацець нагоды
ні шукаць прычыны
каб да часу не заснуць*

*і каб здабыць дарогу
у шляхах нязвыклых марных
дзе згубіць пачатак так
няцяжка
скалацііўшы поле выхадам
на волю
моўчкі плюнуць за плячо*

*у час расплюшчыць вочы
патрабуе ранак сёньня
але ж хіба ён у нас
надоўга
новы дзень прыходзіць
новы дзень праходзіць
зноў нічога не паспеў*

* * *

*Ліпеньскі вечар чакае цябе,
мой сад цвіце,
кветкі склікае ў чароўны букет,
лілею і аквілею
і ружы сярод шалфею,
салодкую мяту
табе адной.*

*Танчыць у кветках апошні прамень,
з яго святлом
рукі і вочы кладуць у вянок
лілею і аквілею,
і ружы сярод шалфею,
салодкую мяту
табе адной.*

*Я узнясу на тваё валасы
стракаты цуд,
сонечны знак патаемных надзей —
лілею і аквілею,
і ружы сярод шалфею,
салодкую мяту
табе адной.*

*Зробіцца праўдай і мары і сны,
і прыйдзе час,
кветкавай песняй узрадуюць нас
лілея і аквілея,
і ружы сярод шалфею,
салодкая мята
і я з табой.*

* * *

1
*Марна зоркі міргаюць,
бо вочы не бачаць нічога.
Можна думаць спакойна,
пакуль не спалохае свет.
Ранак заўтра пакажа
пытанні, сабраныя ўчора,
што упарта чакаюць, —
бо марна ахоўваюць след.*



Фота www.region.by

2
*Пракладаем дарогу,
да новага ранні скрозь вечар.
Абіраем напрамак
паглядам звычайных вачэй.
Набягаючы час
нас сустрэне і крыху палечыць,
І наросціць нам крылы
з апушчаных долу плячэй.*

* * *

*Жыццё мы бачым як умеем,
І сэнс шукаючы, бывае,
так дзіўна часам выглядаем,
калі пры згубленай надзеі
перакідаем апраўданні
па-за рэальныя падзеі.
А быць імкнёмся там, дзе дзеляць.
Быць там, дзе множаць, не жадаем.*

* * *

*Нарэшце ўжо няма пра што казаць,
хаця часы падзеі нараджаюць,
і наваколле нечага чакае,
і шлях любы кірунак дазваляе,
апроч таго, які вядзе назад.*

*За паслядоўным рухам цішыня
У скрыжаванні нежаданых сэнсаў.
Там даўны тлум на кроплю
не паменшаў —
Яго пара на новы замяняць:
Ён зможа на пытанні адказаць,
Але і ён не можа, каб назад...*

* * *

*Услед за восенню, няведама куды,
Не разважаючы,
трапляючы у плынь,
Не ведаць памяці,
не заўважаць сляды,
Калі дзяліць ці памнажаць,
то на адзін.*

*Нязграбнай раніцы
пазбавіцца хутчэй,
Не дачакаўшыся,
пакуль узнікне час,
Кавалкі позіркаў у глыбіні вачэй
Усім пытанням
памыляюцца ў адказ.*

*Па-за самотай,
калі выйсце знодзе шлях,
Пачнецца дзень,
які забудзецца на ноч,
Які пакіне справы лішнія — у снах,
Які ніякіх тлумачэнняў не захоча.*

* * *

*Незадаволенасць шэрасцю неба
І няўлонасць істотнай развагі
Час паскараюць без пэўнай патрэбы,
І не даюць разабрацца з працягам.*

*Месяца холад у цёплым пакоі
Спрэс па пазначаных
пафасам месцах.
Мары мае не былі пра такое,
Але інакш не будзе, здаецца.*

*Вуліцу дзеляць сустрэчныя ветры,
З дома ісці не хачу, але варта.
З мэтай палёгку прыдбаць,
непрыкметна
нешта рабіць,
сустракаючы заўтра.*

* * *

*Бясконцасць замяніць
на рух па коле,
і клопату адразу неяк меней,
ды звыклай праўды новыя адценні
упэўнена фарбуюць хібы сцэнак,
ажно да столі.*

*А дом прыціх,
пакуль
здзіўлення поўны,
Кіруе вечар стомленыя вокны
У лістапад застуджаны і мокры,
Найноўшым снам працівіцца
штомоцы,
але бязмоўна.*

*На кола дзён
націсне
кола лёсу
І — у жаданы бок шляхі адрэжа.
Бясконцасць забярэ з сабой бязмежжа,
У новы клопат нехаця улезе,
і будзе досыць.*

* * *

*Нам застанецца толькі будучыня
З паназдабытага ў мінулым.
Бягучы час шляхі руйнуе,
Не разбіраючы, адкуль яны.*

Куст язміну звініць



Алена БРАВА

Гладкія чорныя валасы Геры — так ён, дарэчы, прапанаваў мне, а не табе, ма, яго называць — блішчаць цьмяна, акурат шэрсць спешчанага ката. Падабенства ўзмацняюць вусы, на іх ты, падазраю, і запала, а як жа, вобраз бацькі, дзяўчынка ў белых калготках і белых бантах плыве на татавых плячах сярод хранічнага зацяжнога першамая.

Госця ты, вядома, пасадзіла на канапу перад тэлевізарам, уключаць які сёння не будуць: мы самі гаворым і паказваем! Але вось перашкода для раскошы чалавечай камунікацыі: у нас дома няма штопара, ад алкаголю ў цябе баліць галава, а госці цяпер такі ж атавізм, як і вусы, твае сяброўкі ў твой дээр шлюць табе эмадзі ў выглядзе чаркі. І вось у цябе госць, не віртуальны, а віно адкрыць няма чым, ай-яй-яй, што зараз будзе! Твая хлусня — тэлефонны званок яму нібыта ў стане алкагольнага ап'янення, які ўраўноўвае цябе з проста бабай, ён баіцца цябе, зразумей, Ляля, ты ж у нас няпростая, так, мам? — твая хлусня праз секунду раскрыецца!

Гэта, вядома, была крайняя мера. Да гэтага ты яшчэ спрабавала захаваць твар і тонка намякала яму ў прыват пра спатканне, а ён не ўязджаў, бо гэта было тваё жаданне, не яго. Такія ўніклівыя яго паводзіны павінны былі цябе насцярожыць, але — навошта? Калі ўжо яно з табой нарэшце здарылася. Сонечны ўдар, апошні вагон ці як там гэта называецца ў літаратуры.

І тады цётка Валя, твая, так бы мовіць, сяброўка, параіла табе набрацца ў дупель, патэлефанаваць яму і запрасіць прамым тэкстам, калі й пашле — да п'янай якія пытанні, вучыла гэтая сука Валя, скажаш потым, што ні храна не памятаеш. І мая маці, дацэнт няхай не сталічнай, але таксама не самай адстойнай ВНУ, сапраўды патэлефанавала гэтаму мужчыну падобным на спушчаную панчоху голасам, паставіўшы перад сабой — для ўваходжання ў вобраз раскаванай шукальніцы прыгодаў — бутэльку віна. Якую нават адкаркоўваць не стала.

Дзевятнаццаць гадзін пяцьдзясят хвілін. З раніцы была адліга, а цяпер мінус тры і страшэнны вецер. На мне джынсы, чаравікі, кароткая куртка. Калі б ведала, што буду стаяць пад вокнамі тваёй кватэры, — пра тое, што яна — твая, ты інфармуеш мяне даволі рэгулярна, — апранула б пухавік. Карціна алеем: узорная дачка дазваляе трохі пажыць асабістым жыццём сваёй адзінокай матулі, у якой раптам здарылася каханне. Аварыя ў апошнім вагоне.

Але вернемся да лайфхака з бутэлькай. Гэта спрацавала. Дзіва што. Жыццёвы досвед такіх сцерв, як Валя, нафаршыраваная філерамі, нібы курыца — чарнаслівам, дакладна не з раманаў пра цнатлівых сакратарак і высакародных алігархаў. Раманаў, якія гэтая Валя, па незразумелай прычыне, дорыць мне ў дзень народзінаў гадоў з дванаццаці. Мабыць, уяўляе, як твая спакутаваная ад пубертату дачка накідваецца на іх, бы булімічка, што сарвалася з разьбы, на пірожныя з крэмам. Ты дзякавала Валі, якая адразу ж надыктавала табе, ад шчадротаў сваіх, рэцэпт цялячых рулецікаў — спецыяльна для спатканкі з ім, Германам-Гераем. Увесь працэс, з наразаннем, адбіваннем, саленнем-перчаннем, скручваннем у міні-скруткі, запяканнем — заняў паўночы, значна прасцей было замовіць сушы або піцу з дастаўкай. Мая маці перакананая, што гатаваць для сябе — пустая трата часу, я не ў лік, ува мне яна бачыць сваю копію, якой выраклася. Але дзеля сэксу з гэтым мужчынам пакорліва скручвала і запякала.

І вось — адбылося: непаслухмянае дзіцятка ляжыць у яе фартуху, па-воўчы ляскае зубамі — у-цю-цю, агушанькі, у нас ужо малочныя прарэзаліся! Сяміесячнае немаўля лічыцца неданошаным, а закаханасць з такім тэрмінам: роўна сем месяцаў таму ў кватэру на першым паверсе ўехаў новы жылец, і мая маці, адшукаўшы яго ў сацсетках, завяла сабе акаўнт і набілася ў фрэндэсы — закаханасць з такім тэрмінам яўна пераношаная і крыху перакошаная ад спазму самаацэнкі, бо так званы Гера купіўся на маміны таварныя дадзеныя далёка не адразу.

Ды і не купіўся ён зусім. Мне гэта стала зразумела на наступны дзень пасля тваёй, мамачка, «горячительной» тэлефоннай лініі. Ён зноў падпільноўваў мяне, калі я вярталася са школы, за прыадчыненымі дзвярыма сваёй кватэры; вой, Лідачка, можа, гарбаткі пап'ем? А чаго, і пап'ем, адказала я раз'юшана, — перада мной яшчэ стаяла маці, якая недарэчна крыўлялася са слухаўкай у руцэ, яна думае, я спала і не бачыла яе прыніжэння. Ашалелы ад шчасця, ён кінуўся на кухню арганізоўваць гарбату, я тым часам сунула нос у адкрыты ноўт і прабегла з дзясятак старонак яго новага рамана, Гера ж у нас пісьменнік, і калі ён пад маркай гарбаты з печывам спрабуе пагладзіць мяне па каленцы, трэба разумець, што ён так вывучае жыццё.

Чаму ён усё ж такі папёрся да нас дамоў? Ну, мам, гэта ж элементарна. Ты не пакінула яму выбару. Ды і аматару малалетак — хто з нас спецыялістка па літаратуры XX стагоддзя, ты ці я? — выгадна становішча сябра сям'і. Дарэчы, як там у вас справы? Усё яшчэ перажываеш з-за штопара? Чырванееш і мямліш, а да суседкі бегчы не хочаш, каб не спаліцца канчаткова? Можаш не хвалявацца: ён даўно забыўся на тое, што апынуўся госцем па тваім жаданні, — зразумела, ён сам гэтага захацеў, таму і тут. Аб'яўляе, мабыць, што адкрыць бутэльку падручнымі сродкамі



Фота www.goodfon.ru

паспрабуе, хоць і не гарантуе поспеху: ён павышаў кваліфікацыю не на гэтай кафедры. Ніколі нічога падобнага не рабіў, хлусіць на чорным воку Герман-Гера, які днямі зухавата адкаркаваў нажом бутэльку сухога. «Можа, вып'еш са мной, малыш?» — «Не».

Мяркую, абрад ініцыяцыі пройдзены. Цяпер госць з веданнем справы разлівае безрэцэптурны сродак, які часта прапісвае сам сабе, па келіхах, я іх, дарэчы, перамыла да Новага года, ты хоць заўважыла? Думаю, не, як і мой падарунак не гледзячы змахнула ў скрыню стала. Крыху віна дастаецца святочнаму абрусу з цэлым гарэмам ліловых касачоў, кранальных, нібыта пахаваныя жыўцом юныя наложнікі. Ацані стыль, ма, вось што значыць вадзіцца з пісьменнікам. Пачакай, зараз ён пачне шпігаваць цябе гісторыяй свайго жыцця, яна ж — сюжэт яго рамана, доўга табе не вытрымаць, гэта вельмі нудна.

Дарэчы, ты ў курсе, што творыць ён пад псеўданімам Герундый Г.? Яго пошласць, па-мойму, адмятае ўсякія паралелі з часцінай мовы, у якой усё ж такі прысутнічае нейкі брытанскі арыстакратызм. Цяпер ён піша раман пра свой развод. Робячы акцэнт на кватэрным пытанні. Не сумняюся, гэта адзіная гісторыя, якую табе здольны распавесці дадзены кадр — самазадаволены, балбатлівы і абмежаваны, у чым ты неўзабаве пераканаешся. І выставіш яго за дзверы. А я вярнуся дадому — ногі, дарэчы, ужо змерзлі.

Дваццаць гадзін трыццаць хвілін. Ты, па-мойму, не помніла сябе, калі выставіла мяне за дзверы. Я толькі паспела адамкнуць іх сваім ключом, як ты выскачыла ў калідор з адным нафарбаваным вокам, перакошаным ад панікі: «Хіба ты не на ангельскай?! Сыйдзі... калі ласка! Да мяне зараз прыйдуць!». Ого, стол накрыты абрусам — тым самым, з ліловымі наложнікамі. «Хто прыйдзе?» — «Якая розніца! Я ўсё жыццё прысвяціла табе, усё! Магу я атрымаць хоць штосьці для сябе?!» І кінула, ужо мне ў спіну, зачыняючы дзверы: «Сходзі да Насці». Я не паспела адказаць, што мая рэпетытарка па ангельскай мове раптам адмяніла ўрок, а аднакласніца Насця, якая жыве ў суседнім пад'ездзе, тыдзень як у лякарні.

Лезу ў кішэню па мабільнік — ён цалкам разрадзіўся. Неспадзяванка. Зрэшты, мабільнік пры такім вятрышчы — так сабе ўцеха. Лепш паскакаць на месцы. Што там у вас адбываецца, га? Нешта мне падказвае: мама ўносіць суперстраву. Паўночы яна пісала гэтаму мужчыну жарсныя лісты на рулеціках з цяляціны, да кожнага маленькага скрутка прымацаваны кружок морквы, бы сургучная пячатка. Гэтыя смачныя пергаменты хутчэй крануць яго сэрца, чым твае паведамленні ў прыват, хай сабе і поўныя бляску эрудыцыі, бо хатняй ежы ён даўно не еў, а жаночы розум для такіх, як Гера, проста цацка. Адкуль я гэта ведаю? Сацсеткі, мама, адбіраюць час, але эканомяць жыццё. Ты і твае раўналеткі ўсе кейсы правяралі на ўласнай скуры, нават падумаць страшна.

Ну, пераканалася? Твае мясныя лісты ён чытае за абедзве шчакі. Ты ж чытаеш ягоны твар, а што там, дарэчы, напісана? «Разумееш, яму складана заводзіць кантакты, у яго гіпертрафаванае пачуццё экзістэнцыйнай віны», — тлумачыла ты Валі, ну так, так, таму ён табе і не тэлефануе, ясны перац. Зараз ён дачытае чарговую эпісталу з забітага каровінага дзіцяці, пасля чаго: а) пераадолее экзістэнцыйную віну — затое віне перад цялём якраз знойдзецца тлумачэнне; б) даведаецца, якая ты выдатная гаспадыня. Пункт «б» яму, уласна, ні да чаго, бо ты ж не збіраешся за яго замуж. Ці збіраешся? І тады ў мяне надыдуць вясёлыя дні, як у дзяўчынкі з ЮэсЭй, кніжку пра яе Герундый падсунуў мне ў першы ж дзень, калі я наведалася да яго ў кватэру. Наіўны. Гісторыю маленькай Ло я прачытала, калі мне было столькі ж гадоў, колькі маленькай Ло. А ты — гадоў у дваццаць пяць і, здаецца, нічога не зразумела.

Маё пачуццё да цябе, мама, нераўнамерна афарбаванае, нібы модная ў эпоху твайго пераходнага ўзросту спадніца-«варанка». Як зрабіць спадніцу аднатоннай? У якой фарбе выварыць любоў і гнеў, каб яны перакіпелі й ператварыліся ў ціхую абыякавасць? Цяпер у модзе аплікацыі. Ну, там кавалачак скуры, чырвонага аксаміту. Падыдзе і абрэзак ад плашча міні, які мая бабуля трыццаць гадоў захоўвае ў шафе ў надзеі на тое, што пачнецца новае, лепшае жыццё, вось тады яна і надзене плашч, імгненна скінуўшы лішніх кілаграмаў трыццаць, год мінулага за кілаграм. Аднойчы я забылася закрыць свой блог, які вяду пад нікам LaLida, — ты сунула нос і ўчыніла мне допыт адносна аўтарства. «Гэта блог адной маладой беларускай пісьменніцы». — «Я і не сумнявалася: мая дачка не здольная так напісаць». А вось настаўніца беларускай мовы кажа, што я надзвычай разумная і таленавітая, з багатай фантазіяй, як табе?

А цяпер я збіраюся выкарыстаць сваю фантазію напоўніцу і паспрабаваць сябе ў драматургіі. Каб не адкінуць тут канькі — у тым ліку ад думкі, што дарагая мама выгнала мяне на мароз, адабраўшы ключы ад кватэры, каб я раптам не ўвалілася, калі яна будзе расшпільваць нагавіцы дарагому Геру. Калі не адмарожу пальцы, потым апублікую ў блогу.

ГЕРОЙ (сербануўшы віна). У мяне ўсё не выходзіць з галавы адна ваша фраза. Вы сказалі: «Не трэба адмаўляць сабе ў задавальненнях».

ГЕРАІНЯ (напружана ўсміхаецца, спрабуючы ўспомніць сваю нібыта п'яную балбатню па тэлефоне). Так... не трэба...

ГЕРОЙ (не забываючы актыўна пражоўваць). Хацелася б удакладніць, што вы мелі на ўвазе.

ГЕРАІНЯ (крышыць у пустую талерку хлеб, як быццам бы збіраецца пакарміць хічкокаўскіх чаек сваіх надзей). Ну, напрыклад... каханне.

ГЕРОЙ (павучальна). Каханне — моцнае пачуццё. Закахаўшыся, мы часта не можам кіраваць сваімі эмоцыямі. Правільным будзе наступнае сцвярджэнне: мужчына і жанчына прыцягваюцца адно да аднаго, бо з'яўляюцца двума супрацьлеглымі паламі. Кожны пол супрацьлеглы для другога, я маю на ўвазе. Вобразна кажучы, каханне — гімн прыродзе. А двое займаюцца любоўю пад гукі гэтага гімна...

Гераіня са шматзначнай усмешкай падымаецца, папраўляе ў вазе кветкі, якія купіла, вядома, сама, вядома, ружы. Ставіць музычны дыск і садзіцца бліжэй да героя.

ГЕРОЙ (адсоўваючыся). Аднойчы мой брат, ён доктар-венеролаг, сказаў: сэнс жыцця — у задавальненнях. Я думаю, пра гэта ён даведаўся ад сваіх хворых, ха-ха-ха, вы, напэўна, чулі гэты жарт: усе хваробы ад нерваў і толькі венерычныя — ад задавальнення

ГЕРАІНЯ (з усмешкай правіслай, як старая вяроўка для бялізны). І праўда, вельмі смешна.

ГЕРОЙ (прыглядаючыся да салаты з парніковых агуркоў, падобных — у незнявечаным выглядзе — да аксесуараў ролевай гульні ў іншапланецян). Давайце тэарэтычна ўявім сабе задавальненні ў выглядзе прыступак, а жыццё — у выглядзе лесвіцы. На першай прыступцы — задавальненне інстынктаў голаду і размнажэння. Як у медаля, тут, вобразна кажучы, два бакі: з аднаго боку, галодны чалавек неперабарлівы ў ежы. З другога — гурман аддае перавагу вытанчаным стравам (кідае пажадлівы позірк на мясныя рулецікі). З аднаго боку — німфаманія...

ад ветру

ГЕРАІНЯ (гледзячы ў залу для гледачоў). Мне і не снілася.

ГЕРОЙ (пастукваючы відэльцам па стале, як па кафедры)….з другога — так-так, вы правільна зразумелі, каханне! Шчырае захапленне чалавечай прыгажосцю…

Я правільна разумею — Гера-Герундый не спяшаецца прайсці ў спальню, дзе, як у рэкламным кліпе аб крылатых анёлах-пракладках, выконваюцца ўсе жаночыя жаданні? Замест гэтага, размахваючы відэльцам, прапануе слухачцы адправіцца разам з ім у рызыкоўнае падарожжа: пазнаваць свет задавальненняў.

– Наступая прыступка лесвіцы, дарагая Людміла Сяргееўна, гэта мастацтва. Ну, значыць, літаратура, музыка, скульптура, — тлумачыць ён кандыдату філ. навук, як разумова адсталай. — Трэцяя прыступка — любоў да прыроды. Вы можаце бачыць на гарадскіх клумбах экалагічна бяспечныя расліны, а на дачных участках — рэдзьку або, да прыкладу, ружу. Ёсць яшчэ вандроўнікі, якія падарожнічаюць дзеля пазнання свету. У нашай з вамі маладосці была такая перадача па тэлебачанні, «Клуб кінападарожнікаў». Я заўсёды яе глядзеў.

Ты з абурэннем думаеш, што як-ніяк на тры гады за яго маладзейшая. Ад злосці ты скусала вусны ў кроў і пад шумок зноў пасоўваешся бліжэй да яго — дрэнная ідэя, твой госць і без таго ўпіраецца грудзьмі ў кут стала.

– Сядзьце бліжэй, вы ж зусім на краі, — цэдзіш ты з прыемнай усмешкай вампіра.

– Нічога-нічога, я ўжо быў жанаты, у другі раз не збіраюся, — міла жартуе ён.

Гучна сапучы, лесвіцу задавальненняў штурмуюць змрочныя прадчуванні й запозненыя адкрыцці. Калі ты зноў уключаеш слых, то чуеш:

– Брат у мяне старэйшы, а я яго малодшы брат. Мая мама вельмі добрая.

– Ах, яна, напэўна, вас проста абажае! — устаўляе зліў, што рабіць зусім не абавязкова: кажа зліў штосьці альбо маўчыць, у яго ўсё роўна спусціць усё, што палічаць патрэбным, а хоць бы і бульбяныя лупіны, і энергічна націснуць на ручку зліўнога бачка.

– Зразумела, я ж яе малодшы сын, а малодшых, я дзесьці чытаў, бацькі заўсёды любяць мацней за старэйшых.

Гэты тып гаворыць цытатамі са свайго рамана — дыхае і піша in the same way. І адно, і другое ў яго выходзіць настолькі пошла, што наводзіць на думку пра гульню банальнасцямі. Як бачыш, я ўважліва прачытала тваю манаграфію. Я палічыла б яго таленавітым тролем, калі б не была ўпэўненая, што ён клінічны графаман. Каб пераканацца ў гэтым, мне хапіла дзясятка старонак яго опуса — і ўсяго XX стагоддзя, прачытанага ў нашай хатняй бібліятэцы.

Але што адбываецца з табой, мама? Ты ж здольная адрозніць добры тэкст ад дрэннага і нават навучыць гэтаму іншых! Як страшна быць жанчынай, якая старанна вучылася ў дзяцінстве, абараніла дысертацыю ў сталасці, усяго дасягнула сама, па дарозе непазбежна згубіўшы перавагі, якімі валодае тупая васямнаццацігадовая прадавачка з піўнухі. А ў сорак чатыры раптам ператварылася ў звар'яцелую істоту, якая накупіла тону амалоджвальных крэмаў і з фальшывым захапленнем слухае — ужо гадзіну і пятнаццаць хвілін, мааа! — нейкага мудзілу, каб ён яе трахнуў.

– Бабуля маіх дзяцей па маці, гэта значыць, маці маёй былой жонкі, знайшла абмен кватэр, і мы з'ехаліся ў трохпакаёўцы ля ваенкамата, — мабыць, ён акурат ускараскаўся на ўлюбёнага коніка. — Там яшчэ крама «Насенне», вы ўяўляеце, дзе гэта, Людміла Сяргееўна? Ну, насупраць скурвендыспансэра, ведаеце? Кватэра была нязручная тым, што адзін з пакояў быў прахадны, гэта было вельмі праблематычна для міру ў сям'і, ну, вы мяне разумееце.

– Так, я вас разумею, — разумее Людміла Сяргееўна.

Дваццаць адзін дваццаць тры. Перабралася на дзіцячую пляцоўку. Тут хоць ад ветру можна схавацца. Рукі-ледзяшы, брр. Спадзяюся, хутка гэта скончыцца, бо ён, зуб даю, падышоў да кульмінацыі — разводу. Акно на другім паверсе працягвае роўна свяціцца. Мама не чакае дачку дадому.

– Хоць міру ў сям'і не было і да таго, як мы пераехалі да бабулі. Мая першая жонка была, ці ведаеце, поўная эгаістка, вобразна кажучы, чорная дзірка. Як я вам ужо казаў, адносіны маёй былой жонкі са сваёй маці, а маёй цешчай, не вызначаліся разуменнем. Неўзабаве мы знайшлі размен, але ён атрымаўся са стратамі.

Адносіны маёй маці са сваёй маці, а маёй бабуляй, таксама не вызначаліся разуменнем, ці ведаеце, мякка кажучы. А вобразна кажучы — мая бабуля вынула з валасоў і кінула за спіну грэбень, што належаў яшчэ яе маці, зубы таго грэбеня ператварыліся ў непралазны лес, у якім мая матуля дагэтуль блукае. Цяпер ёй здаецца: з'явіўся той адзіны, хто выратуе яе з гушчару, бы рыцар — прынцэсу, такі сэнс усяго гэтага беспантовага трэшу з кіданнем жаночых расчосак. На жаль, не атрымаецца.

– Кватэра была цесная, сантэхніка ў вельмі, вельмі дрэнным стане, яе трэба было тэрмінова мяняць, я тады адразу ж звярнуўся ў домакіраўніцтва, але мне сказалі, што гэта за наш кошт. У выніку дзеці апынуліся ў адным пакоі, але самае страшнае было не ў гэтым…

– А ў чым жа? — выпяваеш ты, з ціхай лютасцю прыкідваючы, колькі яшчэ табе слухаць гэтую сямейную сагу. Робячы круглыя вочы ў патрэбных месцах. Твая інтэлігентнасць тут нерэлевантная, мамачка. Трэба было набрацца ў дупель — цётка Валя мела рацыю! — і заваліць яго, як браканьерка — лася. (Узброеная налётчыца — тлустага банкіра. Сакрэтная агентка амерыканскай выведкі — ёлупа-барбуда.) Папярэдне напаіўшы яго чымсьці мацнейшым за к'янці класіка.

Але мая мама не можа выйсці з вобразу харошай дзевачкі. Белыя калготкі. Белыя банты. Белы бусел з дачкой у дзюбе. Дачкой, якую ты выгнала сёння на мароз. Варта было гадаваць-забівацца!

– Самая страшная страта быў кенар, — чуеш ты праз смугу сваёй фрустрацыі. — За скандаламі з бабуляй не заўважылі, як кот, на жаль, не кастрыраваны, які жыў у бабулі і нават харчаваўся разам з намі за адным сталом, што катэгарычна шкодна з пункту гледжання асептыкі і антысептыкі, задушыў Рона, гэта значыць, кенара, і ён загінуў. Мая малодшая дачка патрабавала, каб я паказаў ёй месца, дзе закапаў цела Рона ў скрыні з-пад імпартных басаножак яе маці, якія мая былая жонка купіла на экскурсіі ў вільнюскім універмагу, то-бок экскурсія была ў горад Вільнюс, і калектыў народнага тэатра, у якім іграла мая жонка ў вольны ад хатняй працы час, стаяў у чарзе па басаножкі ў поўным складзе, таму басаножкі яны, можна сказаць, купілі хорам, ха-ха-ха. Але я, вы толькі ўявіце, нікому не паказаў магілу Рона!

Цяпер тваё цярпенне дакладна лопне, ты задушыш гэтага кенара, які расцвыркаўся тут, закапаеш у снезе пад балконам з захаваннем усіх правіл асептыкі і антысептыкі, каб вясной пасадзіць там экалагічна бяспечную рэдзьку або, да прыкладу, ружы. А яшчэ патэлефануеш у скурвендыспансэр і замовіш там сантэхніка, каб ён прыйшоў і кастрыраваў ката, якім ты да таго часу напэўна абзавядзешся.

Дваццаць адзін сорак. Можа, пайсці ў пад'езд? Ага, каб наша суседка, дурніца з аддзела адукацыі, якая на нажах з маман і ўсюды суне свой нос, наслала на нашу сямейку камісіі? Натоўп хмыроў будзе правяраць мой «рэжым» і капацца ў шафе — сэньк ю вэры мач…

Рэмейк аднаго рамана, не Герундыя. Лаліта развалілася ў фатэлі і, боўтаючы нагой у аднай шкарпэтцы, злівае Г. Г. усе свае фрустрацыі з нагоды маці, аднакласнікаў, трагічнай гібелі любімага сабачкі і яго пахавання, прызнаецца ў комплексе Электры, але пры тым не дае ні за якія. Начапіўшы акуляры, да рання разважае пра лесвіцу дазволеных і недазволеных задавальненняў. Гумберт слухае яе адну ноч, другую, трэцюю… затым: а) забівае яе; б) забівае сябе; в) назаўжды вылечваецца ад згубнай жарсці (патрэбнае падкрэсліць).

Мая маці выбірае варыянт г): прыносіць другую бутэльку к'янці. Фіранкі на кухні не зашморгнутыя, і мне выдатна відаць, як яна бярэ віно з шафы.

– Усё больш пераконваюся, што ўсё добрае ў дзецях ад вас, — твой галасавы апарат у прынцыпе ніяк не звязаны з тваімі сапраўднымі пачуццямі. — Як важна мець побач бацьку, які здольны пахаваць птушачку, а не выкінуць у смеццеправод, як герой — так-так, Уэльбека, пісьменніка-маргінала. Вашым дзецям не пашанцавала з маці! — каб спадабацца яму, ты бэсціш няшчасную жанчыну. — Грала ў народным тэатры? Ёй што, сям'і было мала? Навошта нейкая там творчасць, калі ў цябе двое дзетак і разумны, таленавіты, абаяльны муж?

Хлусяць абое, але задаволены адзін. Папрокі былой жонкі абвергнутыя словамі аўтарытэтнай дамы, якая хваліць яго задарма — і на матывацыйныя трэнінгі траціцца не трэба. Цяпер ён, падтасаваўшы факты, «шчыра» паведаміць, як усё было «на самай справе», каб шаноўная дацэнт скончыла падчышчаць і рэдагаваць яго ідэальны вобраз, яго новую сучасную версію: добрага бацькі і мужа, непрызнанага генія.

А што застаецца табе? Узяць сябе за валасы, сцягнуць сваё хіцінавае покрыва, набіць яго кнігамі, якія нічому цябе не навучылі, пустымі слоічкамі ад крэмаў, якія цябе не амаладзілі. Вусенямі безнадзейнасці, чарвякамі самоты, павукамі дэпрэсіі. Лічынкамі смерці. Каб гэтае пудзіла не лопнула, зацягнуць у яго на горле чорныя капронавыя калготкі.

Дваццаць дзве гадзіны. Вецер выдзьмуў з мяне ўсё цяпло. Калачуся буйной дрыготкай, бабуля сказала б — конскай. Жыла б бабуля ў нашым горадзе, я б да яе зараз пайшла, хоць яна і невыносная. У сацсетках у мяне сотні класных сяброў, а пайсці няма да каго.

Я ўсё разумею, мама. З часам — ужо хутка! — ты супакоішся, пачнеш таўсцець, змірышся з адзінотай. А сёння табе хочацца пабыць уратаванай прынцэсай ці кім там яшчэ. У апошні раз. Хіба гэта — злачынства? Сэкс для цябе заўсёды быў па талонах, блакадных сто грамаў у адны рукі, і рукі павінны быць чыстыя, што няпроста, калі ўсё адбываецца на заднім сядзенні машыны, а прывесці каханка дадому ты не магла з-за дачкі. Цябе ж навучылі, бабуля і тэлевізар, як выхоўваць дачку правільна.

Ну, правільна — гэта як? Нельга падаваць дзяўчынцы кепскі прыклад, інакш яна сап'ецца, згуляецца і абавязкова прынясе ў прыполе. Ты ставіш засечкі на дзвярным вушаку, пачынаеш ціха ненавідзець упарты рост дачкі і свае новыя зморшчыны. А што ты так падоўгу робіш у лазенцы, матуля, і потым выходзіш з заплаканымі вачыма, бо табе горка рабіць гэта адной, праўда? Дачка вырасла, цяпер ты можаш дазволіць сабе мужчыну ва ўласнай кватэры — як выявілася, для таго, каб пачуць: вы занадта змрочна глядзіце на рэчаіснасць, дарагая Сяргееўна, у жыцці шмат добрага, так-так, вы зусім хутка ў гэтым пераканаецеся, ужо нядоўга чакаць засталося!

– У нейкай вельмі душашчыпальнай тэлеперадачы вядучая, я запомніў, дзялілася з тэлегледачамі трывогай з нагоды свайго будучага саракапяцігоддзя. Зусім хутка я з поўнай на тое падставай пазваню вам у дзень вашага ўжо блізкага юбілею і спытаю: як там, напярэдадні шостага дзясятка, га, Сяргееўна? Як гаворыцца, мы настолькі маладыя, наколькі сябе маладымі адчуваем!

Твой госць адпраўляе ў пашчу апошні рулет. Усе мясныя лісты дайшлі, адрас аказаўся правільным. На шчасце, ён не бачыць у гэты момант твайго твару, на якім, аніколькі не сумняюся, адбіліся ўсе твае сапраўдныя пачуцці.

У вокнах першага паверха з'явілася святло. Начнік у спальні другога паверха не запаліўся. Мастацкі фільм пра каханне з табою ў галоўнай ролі скончыўся, так і не пачаўшыся. У адрозненне ад майго татулі, пераможнага героя ўжо трэцяга такога кіно, з усё больш маладымі партнёркамі. Пад бадзёры саўндтрэк ідуць цітры — Гера ўжо ўдома, яго зачакалася вялікая літаратура.

Ён спадзяецца, што ты ўсё зразумееш сама. Што цяпер да цябе нарэшце дойдзе. Круціць з табой раман ён не збіраецца. Ён цябе толькі што паймеў, пранік у цябе глыбей, чым мог бы там, у спальні. Глыбей, чым пранікаюць штыком альбо хірургічным інструментам. Ён параніў тваю эмацыйнасць, дабіў самаацэнку. А заадно зліў у цябе памыйнае вядро сваіх баек. Не са злосці — ад чыстага сэрца. Ён усяго толькі аддае перавагу дачцэ, а не маці. Кейс Гумберта. Не, Герундыя.

Можна ісці дамоў, але не хочацца. Ды і нейкая млявасць з'явілася, цягне прылегчы пад кустом язміну, у сумёт з жоўтым простакутнікам святла пасярэдзіне, нібы запраўленая ў стары бабулін падкоўдранік вярблюджая коўдра. Ты на мяне забылася, мама, інакш абавязкова выглянула б у акно, як выглядвала кожную хвіліну, калі я ў дзесяць гадоў не прыйшла своечасова ад Юлькі. А я прыйшла ад Юлькі. І забралася ў язмінавы куст; сёння яго галінкі абледзянелі, а тады ён квітнеў. Мне было так саладка, што хацелася памерці, але і дадому хацелася таксама, таму што ты мяне чакала.

На маім гадзінніку дваццаць два дваццаць. Узнімаюся на другі паверх. Званю ў дзверы. Цішыня. Цісну на званок па новай. І тут да мяне даходзіць: ты паспела ўжо нараўсціся ў слухаўку, дапіць па парадзе «сяброўкі» другую бутэльку плюс закінуцца феназепамам (сука Валя!), практыкі да такіх экзерсісаў у цябе няма, і ты валяешся ў адключцы. Стукаю ў дзверы кулаком. Ані гуку. Затое ў суседняй кватэры, дзе жыве цётка з адукацыі, чуваць варушняк — гэтага толькі не хапала!

Зноў на вуліцы. Куст язміну звініць ад ветру. Назіраю за дзвіжухай у кватэры на першым паверсе. Яе жыхар ходзіць па пакоі з кубкам у руцэ. Падобна, у яго прыліў натхнення. Я таксама не адмовілася б зараз ад кубачка гарбаты. Гарачай, з печывам, ён яго купляе спецыяльна для мяне. Яму горача, выходзіць на балкон з цыгарэтай.

– Гэта ты, Ліда? Што ты тут робіш, малыш? Зараз я спушчуся да цябе, толькі не сыходзь… Яна што, не пускае цябе дадому? У такі мароз… калі б я ведаў… хадзем да мяне, табе трэба сагрэцца…

А чаму б і не? Якая розніца. Гэты ці іншы. Чым раней пачнеш, тым менш шанцаў дажыць да сарака гадоў дзяўчынкай у белых бантах і закахацца пад канец у якога-небудзь прыдурка. Калісьці з кімсьці ўсё адно давядзецца пачынаць. Тады чаму не з гэтым? Не цяпер?

Не з гэтым. І не цяпер.

Акурат калі я гатовая зрабіць крок у яго цёплую пячорку, чую, як на другім паверсе паварочваецца ў замку ключ.

«Іду ў сад, дзе мне ўтульна і памоцна...»

Ніна Мацяш — Антуан дэ Сент-Экзюперы

Марыя НОВІК

«Мой Экзюперы» — так назвала сваё эсэ Ніна Мацяш пра ўлюбёнага французскага пісьменніка, якога цаніла за мужнасць, за філасофскую глыбіню і мудрасць, за пранікненне ў свет чалавечага і прыроднага космасу... Як зазначыла пісьменніца, ён прыйшоў да яе рана: «Не ў школе, праўда, а ўжо ў інстытуце, на лекцыях па французскай літаратуры. Прыйшоў увесь і назаўсёды».



Перш чым узяцца за пераклад, яна шукала інфармацыю пра самога пісьменніка, пра яго жыццё. У дзённікавых запісах ад 20 снежня 1982 года — даволі аб'ёмны канспект найбольш цікавых урыўкаў з кнігі М. Міжо «Сент-Экзюпери. Жизнь замечательных людей. Серия биографий» (Выпуск 9. — Москва, 1963).

Менавіта Ніна Мацяш адкрыла па-беларуску «Планету людзей» (1984, 1996). Менавіта гэты пісьменнік стаў ёй на ўсё жыццё тым садам, дзе ратавалася, дзе натхнялася, дзе гаварыла душою: «Я іду ў сад, дзе мне ўтульна і памоцна. Іду да Сябра, які і разважыць, і падбадзёрыць мяне сваім словам, паможа выверыць жыццёвы шлях. Які б твор ні разгарнула — «Начны палёт» або «Планету людзей», «Ваеннага лётчыка» або «Ліст да заложніка» — голас Ягоны — як лекі. Ад самоты, ад разгубленасці, ад зняверы, ад стомы. Пэўна, таму, што думкі пісьменніка — не адстароне647 разумаванне, а вывераныя высновы і перакананні чалавека, які шмат перажыў, зведаў і радасці, і смуткі, і паразы, і перамогі».

Гэта Ніна Мацяш прывяла ў Беларусь «Маленькага прынца». Ён жыве ў беларускай прасторы разам са словам перакладчыцы ўжо больш як тры дзесяцігоддзі — у 2019 годзе з'явілася ўжо чацвёртае выданне гэтага твора. Ніна Мацяш напісала лібрэта, песенныя тэксты да спектакля, а музыку — кампазітар Валянцін Перапёлкін з Янава, і ў 2002 годзе ў Доме культуры ў Янаве адбыўся спектакль «Маленькі прынц», на ім прысутнічала і сама перакладчыца. «Гэты твор, — як вызначыла Ніна Мацяш, — можна параўнаць з чароўным жывільным дрэвам, у цудоўнай кроне якога кожнаму, ад малога да старога, знойдзецца адпаведны дзівосны плод».

Кнігі Антуана дэ Сент-Экзюперы сталі ўлюбёнымі кнігамі перакладчыцы Ніны Мацяш. Перакладала з ахвотаю, шукала ягоныя творы самастойна ці праз сваіх сяброў з Нямеччыны. Хацела ведаць больш пра яго зямное няпростае жыццё. На той час інтэрнэту ў Беларусі яшчэ не было, таму сябры прысылалі кнігі, адбіткі інфармацыі з перыёдыкі, копіі кніг. Ліставанне з Дзмітрыем Ярашэўскім адкрывае нам гэты няпросты шлях да многіх французскіх і франкамоўных пісьменнікаў.

У лісце ад 17 красавіка 1995 года, ведаючы, што Міця (так называла Ніна Мацяш Дзмітрыя) у хуткім часе будзе ў Францыі, яна звяртаецца да яго з просьбай: «Калі будзеце ў Францыі (а я ў гэтым не маю ніякага сумневу), то хай ужо будзе Вашая ласка пашукаць там «Дзённік» Жуля Рэнара і перапіску Антуана дэ Сэнт-Экзюперы. Буду шчыра ўдзячная. Магчыма, некалі перакладу на беларускую гэтыя рэчы».

Дасылаючы паштоўку з Авіньёна, Дз. Ярашэўскі паведамляў: «Учора мы наведалі гэты цудоўны горад, пра які Вы, напэўна, многа чулі. Горад жыве своеасаблівым жыццём. Гэта трэба пабачыць. Кніжку J. Renard «Journal» я знайшоў адразу, але «Correspondanci» A. Exupery няма. Можа, назва гучыць інача. Напішыце мне назву па-французску, я закажу з Готы. Вы ведаеце яго кніжку "Terre des homes"?»

Радавалася, атрымаўшы вестку, што сябра шукае неабходныя ёй выданні: «Кажаце, натрапілі на Рэнара. Дзякую! Што да ліставання Экзюперы, на жаль, я не ведаю, пад якой назвай яно магло выдавацца. Магчыма, у выбраных творах? А мо й асобна (гэта нават верагодней). Я маю арыгінал «Планеты людзей», дзе змешчаны «Начны палёт», «Планета...», «Ваенны лётчык» і «Ліст да заложніка». Усё гэта выйшла асобным выданнем у маім перакладзе па-беларуску. Ёсць у мяне і «Citadelle» ягоная, калі адважуся, то, магчыма, перакладу і гэтую рэч. Экзюперы мой любімы аўтар, адсюль і гэткая ўвага да яго» (26 ліпеня 1995 г.).

У лісце ад 29 верасня 1995 года Н. Мацяш дзякавала за знойдзеныя матэрыялы: «Усцешыла Вашае паведамленне пра лісты да маці Экзюперы. А да жонкі, да Кансуэлы, да сяброў? Вельмі шчыра дзякую, дружа, за турботу». Асаблівая радасць была, калі трымала кнігі французскага пісьменніка ў руках.

Ніна Мацяш 19 красавіка 1996 года паведамляла: «Шчыра дзякую, Дзімачка, за кнігі. «Courrier sud», праўда, можна было не купляць, я маю гэты твор, і перакладала яго. Усе ж астатнія — цікавыя рэчы. Улічваючы Вашу прапанову, звярнула ўвагу й на спіс новых выданняў. Калі гэта не ляжа каменем на Ваш бюджэт, была б удзячная за «Maximes d'Epikure» і «Les Contes merveilleux» de Hermann Hesse. А можа яшчэ натрапіцца якая-небудзь танная анталогійка сучаснай французскай паэзіі: я яе зусім не ведаю. Зрэшты, не дужа цямлю, калі я папрацую нават над ужо набытым і перададзеным Вамі».

15 кастрычніка 1996 года: «Да "Цытадэлі" яшчэ не прыступала, нешта не магу й кнігу адшукаць, пры пераездзе шмат што ў хованкі са мною згуляла; зрэшты, я й шукаю яшчэ не дужа заўзята, бо маю што рабіць, каб да звыклага ўтулля й новае жытло давесці.

З удзячнасцю прымаю Вашае запрашэнне пагасціць у Вас пры нагодзе. Богведама, калі, і ці надарыцца ўвогуле яна, але хацелася б скарыстацца й магчымасцю замацаваць нямецкую мову: размаўляць я амаль не магу на ёй, усё забылася. І ў Францыю хочацца! Ды дзе грошай набрацца? Перавыдалі ў серыі «Школьная бібліятэка» мой пераклад «Планеты людзей» і «Маленькага прынца», дык заплацілі ...730.000 беларускіх рублікаў! Пры цяперашнім курсе валютным гэта 35 даляраў...».

Праца над перакладамі працягвалася. Ліст Ніны Мацяш ад 11 лютага 1998 года Міцю Ярашэўскаму адкрывае нам старонкі жыцця і працы перакладчыцы:

«Дзякую за ліст, за здымак. <...> Здаецца, я пісала табе, што планавала легчы ў Сяльцы ў лякарню дзён на дзесяць. Тэрмін задоўжыўся напалавіну, бо быў высакаваты, як для мяне, ціск, дык Сяргей Сяргеевіч (помніш яго?) спачатку яго адладжваў, а пасля ўжо і за хрыбет узяўся. Зараз адчуваю сябе значна лепш, С. С. паздымаў усе блокі остэахандрозныя. Ляжала я з сястрой Оляй, дык і яе «падрамантаваў».

Я працавала там, пераклала ўсяго petit Nikola, праўда, яшчэ патрабуецца праца з ім за друкаркай, але — радуюся, што зрабіла гэтую работу і, здаецца, няблага. Знайшоў мяне там, у Сяльцы, і заказ Норберта на слоўка пра Эльке Эрб. Галя потым адфаксоўвала яго ў Берлінскі ўніверсітэт, але, баюся, што запазніўся мой той матэрыял, бо трэба было да 30 студзеня, а факс пайшоў аж 2 лютага. Норберт пакуль маўчыць. Эльке — не ведаю, калі — 60 гадоў...».

Урывак з ліста Н. Мацяш ад 16 сакавіка 1998 года:

«Упакавала я Nikolas свайго ў папкі, пры нагодзе перадам у Мінск, а не, дык самі з Галяю адвязем, калі паедзем на з'езд пісьменнікаў. Ён мае адбыцца 23-га красавіка».

Паступова прыходзілі новыя навіны. У паштоўцы ад 19. 03. 1998 года з выявай Notre-Dame Дз. Ярашэўскі паведамляў: «Быў на зімовых канікулах у школе недалёка ад Парыжа, адкуль гэта паштоўка. Купіў «Eckris de guerre» і «Courrrier sud» de S.-Exupery. У першай кніжцы ёсць лісты да сяброў і толькі два да жонкі. Больш нічога не знайшоў, хаця Парыж і вялікі. Многія кнігарні нічога не ведаюць пра лісты да жонкі».

10 ліпеня 1998 года:

«Сёння адаслала Юрасю Бушлякову пераклады вершаў французскіх набелятаў — Жыда, Марыяка, Мэтэрлінка.

Вельмі прыдалася мне твая парыжская анталогія французскай паэзіі. Можа, я пісала табе ўжо, што перакладаю з яе вершы — па тры творы — Марыяка, Жыда і Мэтэрлінка. На гэтым тыдні, спадзяюся, і перадрукую перастворы свае, і адашлю Юрасю Бушлякову ў Мінск, хай скарыстоўвае ў сваім выданні».

10 кастрычніка 2000 года:

«Добрая ў мяне сёлетняя восень, уласны верасень. Напісала 8 песенных тэкстаў для спектакля па «Маленькаму прынцу».

3 снежня 2000 года:

«Вярнуся з Брэста, трэба будзе ўзяцца за лібрэта па «Маленькаму прынцу». Яно збольшага ўжо прадумана, і песенныя тэксты напісала ды перадала кампазітару яноўскаму — Валянціну Перапёлкіну. Але трэба хутчэй даць яму лібрэта, бо...».

Так Ніна Мацяш атрымала ад Дзімы Ярашэўскага адбіткі кнігі Рэнэ Гасціннага «Маленькі Нікаля», ад Жанін Бод — кнігі пра самога аўтара, перакладала з добрым настроем, падчас сустрэчаў чытала перакладзеныя старонкі, і было добра разам з ёю далучыцца да перажыванняў маленькага Нікаля, і ўсміхацца, і весела смяяцца разам з Нінай Мацяш... Вельмі хацела падарыць гэтую кнігу беларускаму чытачу, аддала яе ў выдавецтва... Чакала выхаду, аднак выдання кнігі не адбылося.

У лісце да Міці Ярашэўскага ад 8 лістапада 2004 года:

«Наша Ніва» змясціла ўрывак (замоўлены) з «Дзень добры, смутак» Саган. Хоць гэтая праца не прапала. А «Маленькі Нікаля» дагэтуль у летаргіі ў выдавецтве. Ці амбасада Францыі не дала абяцаных грошай, ці даўно ўжо яны сплылі богведама куды».

Напрыканцы пераклала аб'ёмны, апошні твор Антуана дэ Сент-Экзюперы — «Цытадэль». На той час у Ніны Мацяш ужо з'явіўся камп'ютар, і яна радавалася, што можна дапрацоўваць — шліфаваць першасны тэкст перакладу, і камп'ютар дае ёй новыя, больш лёгкія магчымасці: не трэба крэсліць, можна выбіраць з прапанаваных варыянтаў патрэбны і не передрукоўваць тэкст нанова...

4 красавіка 2005 года:

«Кампутар мяне ўжо не баіцца, хоць цюцік часам і гаўкае (памочнік). Працуецца з задавальненьнем (перакладаю «La citadelle» de Saint-Ex.), вельмі ж ужо добра «габляваць» пераклад. А Галя яшчэ й пару праграмаў падкінула, дык час прамарнаваць — non probleme!».

У архіве Ніны Мацяш захаваўся машынапісны тэкст гэтага перакладзенага ёю твора з вялікай колькасцю магчымых варыянтаў да пэўнага слова, выразу, адрэдагавала яна і набрала на кампутары толькі дзесяць старонак. Калі б знайшоўся перакладчык з веданнем французскай і беларускай моў, які б з павагай паставіўся да яе тэкста, гэты твор прыйшоў бы да беларусаў у роднай мове, і такім чынам збылася б і мара пісьменніцы пра пераклад усіх твораў Экзюперы.

Пераклады Ніны Мацяш кнігі «Цытадэль» Антуана дэ Сент-Экзюперы і Рэнэ Гасціннага «Маленькі Нікаля» цяпер, ужо набраныя з машынапісных і рукапісных старонак Ніны Мацяш, ёсць у электронным выглядзе. Думаецца, што знойдуцца выдавецтвы, якія змогуць ажыццявіць выданне гэтых неапублікаваных перакладаў Ніны Мацяш. Неўзабаве — 80-гадовы юбілей паэткі і перакладчыцы. Гэта былі б добрыя падарункі беларусам і годнае ўшанаванне памяці мужнай і таленавітай пісьменніцы.

Працуючы з архіўнымі матэрыяламі Ніны Мацяш, яшчэ і яшчэ раз адкрываецца, як многа душы і сэрца ўкладала яна ў сваю працу, як ахвярна і мужна працавала, як верыла, што мудрыя творы сусветнай літаратуры прыйдуць да беларусаў. Сёлета, калі споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння Антуана дэ Сент-Экзюперы, беларусы, дзякуючы Ніне Мацяш, маюць у сваёй роднай мове кнігі гэтага сусветна вядомага пісьменніка, у якіх — шлях да спазнання сябе, шлях да Любові, Веры, Дабрыні... Гэта шлях да душы чалавека, бо пісьменнік, як зазначыла Ніна Мацяш, «запрашае чытача паразважаць разам з ім і — паглядзець на сябе знутры, пабыць з самім сабой, з гэткім, якім ёсць у сапраўднасці, у ісце сваёй, не заслоненай будзённай пустапарожнасцю, мінальнасцю, неабавязковасцю».

Гэта і далучэнне да філасофіі таленавітых творцаў — Антуана дэ Сент-Экзюперы і Ніны Мацяш. Гэта запрашэнне ў чароўны сад Слова...

(Аўтарка выказвае ўдзячнасць Наталлі і Руслану Мацяшам і Дзмітрыю Ярашэўскаму за выкарыстаныя матэрыялы.)